

ШКОДНАЯ КВЕЦЕНЬ ЗАХОПЛІВАЕ ТЭРЫТОРЫЮ МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА... І ШТО ДАЛЕЙ? 5



7 ВЕРАСНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 172 (28788)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

*«Дакладны алгарытм работы са старым і пустуючым жыллём паспрыяе наведзенню парадку ў сельскіх населеных пунктах і гарадах. Скарачэнне выдаткаў і дакументаабароту, больш аператыўныя спосабы ўключэння ў абарот, магчымасць прамога продажу або выстаўлення на аўкцыён станоўча адаб'юцца на вырашэнні гэтага пытання. У Гродзенскай вобласці работа па ўключэнні ў абарот старых і пустуючых дамоў вядзецца сістэмна. Для вырашэння праблемы створана рабочая група. Распрацаваны метадычныя мерапрыемствы, дзе былі дадзены тлумачэнні розных нюансаў, а іх пры гэтым працэсе нямала. Актыўна выкарыстоўваецца вопыт раёнаў, дзе найбольш паспяхова працуюць у гэтым кірунку. Новы ўказ дазволіць актывізаваць і зрабіць працу ў гэтым кірунку больш эфектыўнай».*

# РАКАЎСКІ ПЛЕНЭР



Паліна Паўлавец і Паліна Стрыга, Марыя Хадаркевіч і Аляксандра Сівакова, удзельніцы студыі мінскага мастака Уладзіміра Сайко, прыехалі на аднадзённы пленэр, каб маляваць архітэктуру старажытнага Ракава — былога мястэчка, а цяпер — аграгарадка ў Валожынскім раёне. На гэтым фота дзяўчынкі са сваімі работамі, на якіх — парафіяльны касцёл Маці Ружанцовай і Святога Дамініка. Юныя мастачкі выбралі месца для малявання насупраць франтона будынка, але, згадзіцеся, работы атрымаліся розныя — і па ракурсе, і па кампазіцыі, і па колерах: у кожнага творцы сваё бачанне, настрой, стыль — мова, якой яны перадаюць адносіны да навакольнага свету. І ў тым ліку да Ракава і яго славутасцяў.

Не першы год дзяўчынкі наведваюць мастацкую студыю. Аляксандра СІВАКОВА *(на фота справа)* сёлета паступіла ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт на факультэт мастацтва і камп'ютарнай графікі. Побач з Аляксандрай пазіруе Марыя ХАДАРКЕВІЧ, якая стала студэнткай Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, але па-ранейшаму працягвае займацца жывапісам, з эцюднікам і мальбертам ездзіць у творчыя экспедыцыі, удзельнічае ў пленэрах. Дзве Паліны — ПАЎЛАВЕЦ і СТРЫГА — вучацца ў сёмым класе (дарэчы, у адной школе — у пасёлку Бараўляны і нават у адным класе). Іх аб'яднала захапленне маляваннем, і дзяўчаты з поспехам пракладваюць сваю дарогу ў свет высокага мастацтва.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўзнагароджана дыпломам Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА.**
- Паркі сямейных дрэў з'явяцца ў Беларусі ў 2019 годзе. Гэта будуць месцы, дзе кожная сям'я зможа пасадзіць сваё дрэва з нагоды шлюбу, нараджэння дзіцяці.
- **Прэм'ера оперы «Саламея» ў Нацыянальным тэатры оперы і балета перанесена.**
- Сям'я — пераможца рэгіянальнага этапу конкурсу «Уладар сяла» ў Віцебскай вобласці ў якасці прыза атрымае цяля.



- **Два новыя дзіцячыя садкі — у раёне Лябяжы і мікрараёне Сухарава — адкрылі ў Мінску да Дня горада.**

ISSN 1990 - 763X
18172

■ Занятасць

## Ці хапае ў Оршы працоўных месцаў?

### І чаму на асобных прадпрыемствах бяда са спецыялістамі

**«Маладых нават месца ў інтэрнаце не трымае. 305 рублёў — ну што гэта, нармальны заробак для іх? Адпрацоўваюць два гады і з'язджаюць: хто — у Віцебск, хто — у Гомель», — прызнаюцца на адным з аршанскіх заводаў. Днямі ў Оршы прайшоў кірмаш вакансій. «Звязда» пабывала там, каб даведацца пра сітуацыю з работай у буйным прамысловым раёне, які апошні час знаходзіцца пад пільнай увагай усёй краіны.**

**Ад грузчыка да вядучага інжынера-энергетыка**

На пачатак верасня ў раёне налічвалася 816 вакансій. Большасць з іх (77 працэнтаў) — па рабочых прафесіях.

Так, шмат работнікаў патрабуецца ў будтрэст № 18. Па дзесяць маляроў-тынкоўшчыкаў і муляраў, чатыры электраманцёры, тры страхары...

— Новых аб'ектаў хапае, узводзім цяпер жылыя дамы, таму патрэбны людзі. Бяром толькі са спецыяльнай адукацыяй, за выключэннем падсобных рабочых, — расказвае прадстаўніца прадпрыемства. — Заробак здзельна-прэміяльны, у асноўным 400—450 рублёў у нас атрымліваюць.

СТАР. 4

■ Багаты час

## БУДЗЕМ З БУЛЬБАЙ І З ЯБЛЫКАМІ

### А яшчэ сёлета ў нас урадзілі чарніцы — у сем разоў больш, чым летась

**Эксперты разлічваюць, што сёлета ва ўсіх катэгорыях гаспадарак збяруць каля 6,2 мільёна тон бульбы, 1,8 мільёна тон агародніны і 534 тысячы тон пладоў і ягад, паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Таццяна КАРБАНОВІЧ. Гэты ўраджай дазволіць забяспечыць як патрэбы ўнутранага рынку, так і пастаўкі на экспарт. Арганізацыі ўжо пачалі збор агародніны і садавіны.**

**Пладоў і ягад ужо ў разы больш**

Па даных на 5 верасня, у краіне ўжо ўбрана 3,5 тысячы гектараў бульбяных палеткаў (12 %), накапана 113 тысяч тон клубняў пры сярэдняй ураджайнасці 332 ц/га. Сабрана 121 тысяча тон агародніны (113 % у адносінах да даных на аналагічную дату мінулага года), 10,4 тысячы тон пладоў і ягад (у тры разы больш, чым летась). Ураджайнасць па многіх культурах вышэйшая за мінулагодні ўзровень. У прыватнасці, чакаецца багаты ўраджай яблыкаў. Найбольшыя аб'ёмы пладоў збяруць аграрыі ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях.



Фота БелТА.

**Запас бяды не чыніць**

Сёлета плануецца нарыхтаваць на насенне 190 тысяч тон бульбы, на прамысловую перапрацоўку — 180 тысяч тон, у гандлёвыя арганізацыі, на закладку стабілізацыйных фондаў — 165 тысяч тон. Каля 645 тысяч тон караняплодаў плануецца рэалізаваць на рынках і кірмашах, а таксама накіраваць на экспарт. Што датычыцца агародніны, то 180 тысяч тон паступіць у гандлёвую сетку, яшчэ 40 тысяч тон — на перапрацоўку, 349 тысяч тон — у продаж на кірмашах і рынках. Для захоўвання прадукцыі ў сельгасарганізацыях створаны неабходныя ўмовы. Так, магутнасць бульбасховішчаў складае 775 тысяч тон, агароднінасховішчаў — 158 тысяч тон, пладасховішчаў — 103 тысячы тон.

СТАР. 3

# БЮДЖЭТ, ЕЎРАПЕЙСКІЯ ГУЛЬНІ І ФУТБОЛ

## Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам прэм'ер-міністра Сяргея Румаса

**Прэзідэнт папрасіў коратка выкласці сітуацыю па гэтым годзе: як развіваецца эканоміка Беларусі з улікам тых выклікаў, якія ёсць і якія магчымыя. «Натуральна, з выхадам на фінансы, паколькі вы, як ужо дасведчаны банкір, сітуацыю, напэўна, зможаце ацаніць, асабліва на гэтай пасадзе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

Другі момант — гэта планаванне бюджэту на наступны год. Беларускі лідар адзначыў, што «чуе» сродкі масавай інфармацыі, якія паведамляюць аб тым, што пакуль ідуць спрэчкі паміж новым урадам і былымі яго членамі з нагоды неабходнасці вярстаць бюджэт на два-тры гады, а то і на пяць гадоў наперад. Кіраўнік дзяржавы папрасіў выкласці пункт гледжання цяперашняга складу ўрада наконт гэтага.

«Тым не менш, пакуль мы тут разважаем пра нейкія больш працяглыя тэрміны, у нас наперадзе 2019 год, мы традыцыйна яго плануем. Як работа ва ўрадзе вядзецца? — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка. — Трэцяе: у мяне быў Качыянчыч (прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў. — **«Зв.»**), мы з ім абмяркоўвалі праблемы нашай еўрапейскай алімпіяды. Яшчэ раз хачу падкрэсліць: мы не павінны замахвацца на вялікія выдаткі, як гэта было, дапусцім, у Азербайджане. У нас няма такіх грошай, ды і не патрэбна».

На думку кіраўніка дзяржавы, Беларусь павінна вызначыцца сваёй «душэўнасцю, адкрытасцю дзяржавы і народа і правесці прыгожыя Еўрапейскія гульні». «Як ідуць справы ў гэтым аспекце?» — такое пытанне адрасаваў ён Сяргею Румасу.

Прэзідэнт задаў пытанні прэм'еру і як кіраўніку Беларускай федэрацыі футбола: «Народная гульня, самая маштабная гульня, якая прыцягвае больш за ўсё насельніцтва. Радавацца асабліва тут няма чаму, але, тым не менш, якія там у нас ёсць перспектывы?»

У размове былі закранутыя пытанні фарміравання ўрада.

У адказ Сяргей Румас яшчэ раз падзякаваў Прэзідэнту ад прызначаных членаў урада і сябе асабіста за аказаны давер. Паводле яго слоў, усе новыя людзі без разварушвання ўключыліся ў працу і сёння ўрад функцыянуе ў штатным рэжыме, вырашаючы вызначаныя для яго задачы.

Прэм'ер-міністр далажыў Аляксандру Лукашэнку аб выніках работы эканомікі краіны за студзень — ліпень бягучага года, а таксама аб прагнозе па ключавых пазіцыях да канца года, які маецца ва ўрадзе. «Сёння асноўная задача ўрада — гэта падрыхтоўка прагнозных дакументаў на 2019 год. Мы разгледзелі на мінулым тыдні на пасяджэнні Саўміна праект прагнозу, праект бюджэту ў комплексе са зменамі ў Падатковы кодэкс, і ўсё гэта, вядома, ва ўвязцы з асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі. Мы прынялі неабходныя рашэнні і ўжо павінны былі ўнесці дакументы, але трошкі зацягнулася ў нас узгадненне з Камітэтам дзяржкантролю», — адзначыў Сяргей Румас.

**Па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам прэм'ер-міністр пагутарыў з журналістамі.**

«Кіраўніку дзяржавы было дalожана, што ўсе асноўныя паказчыкі, якія вызначаны прагнозам і бюджэтам на 2018 год, будуць выкананы. І ўрад усе свае намаганні прыкладае на тое, каб шэраг паказчыкаў аказаўся вышэйшы за прагноз», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Ён нагадаў, што сёння рост ВУП перавышае паказчыкі, устаноўленыя ў прагнозе, хоць на працягу апошніх месяцаў — другога і трэцяга кварталаў — азначылася пэўнае запаволенне, звязанае ў асноўным са знешнімі фактарамі. Аднак урад сёння працуе над тым, каб выкарыстоўваць іншыя рэзервы і змяніць гэту негатыўную тэндэнцыю, дадаў Сяргей Румас.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, беларускі лідар падрабязна цікавіўся 2019 годам у кантэксце складаных узаемаадносін з Расійскай Федэрацыяй. Ён адзначыў, што на працягу некалькіх дзён пакет дакументаў (прагноз на наступны год, праект бюджэту са зменамі ў Падатковы кодэкс, грашова-крэдытная палітыка) будзе ўнесены ў Адміністрацыю кіраўніка дзяржавы.

На фармуляванне прапаноў па змяненні структуры ўрада Сяргей Румас папрасіў у Прэзідэнта час. «Ёсць пэўныя погляды, якая структура павінна быць. У нас 36 членаў урада, напэўна, гэта для маленькай, кампактнай краіны вельмі вялікая колькасць», — сказаў ён.

У адказ на пытанне пра тое, ці абмяркоўваліся з Прэзідэнтам будучыя перагаворы з Расіяй, Сяргей Румас нагадаў, што ў панядзелак адбылася яго размова з Дзмітрыем Мядзведзевым. У цэлым урады актыўна рыхтуюцца да сустрэчы 21 верасня. «У нас вельмі шырокі парадак дня, тых пытанняў, якія мы хацелі б абмеркаваць, і, галоўнае, паставіць кропку, а не шматкроп'е, — падкрэсліў прэм'ер-міністр. — Мы дамовіліся з Дзмітрыем Анатольевічам, што віцэ-прэм'еры па напрамках прапрацуюць гэтыя пытанні для таго, каб нейкія дробныя і зразумелыя для абодвух бакоў пытанні не выносіць на суд Прэзідэнтаў як нявырашаныя, а адразу па іх прыняць рашэнне».

Ён падкрэсліў: выкананне задачы кіраўніка дзяржавы па дыверсіфікацыі нашага экспарту і выхадзе на рынкі трэціх краін неабходна для таго, каб залежнасць ад аднаго партнёра не была такая значная.

Акрамя таго, прэм'ер-міністр расказаў журналістам, што ў планах на 2019 год — рэфінансаваць адзін мільярд долараў, гэта адно з пытанняў вялікага парадку дня, якія ёсць з Расіяй. Вядзецца абмеркаванне гэтага аспекту, пацвердзіў Сяргей Румас. Што датычыцца траншаў па лініі Еўразійскай фонду стабілізацыі, то, па словах прэм'ера, шосты і сёмы не паступілі, гэтыя пытанні таксама на парадку дня 21 верасня.

Таксама на сустрэчы абмяркоўвалі II Еўрапейскія гульні. Па словах Румаса, пад яго кіраўніцтвам ужо праведзена першае пасяджэнне арганізацыйнага камітэта. Ён адзначыў, што ўсе мерапрыемствы ідуць па плане, ёсць пэўныя складанасці з часовай інфраструктурай, не да канца выпрацавана схема, як яна будзе ўвезена ў Беларусі. Тым не менш профільны камітэт пад кіраўніцтвам мэра Мінска ведае гэтыя пытанні і ў найбліжэйшы час з гэтым вызначацца, запэўніў Румас.

Што датычыцца футбола, то кіраўнік дзяржавы папрасіў прем'ера дапрацаваць тэрмін на чале з Беларускай федэрацыяй.

Сяргей Румас таксама пракаментаваў сітуацыю ў беларускім футболе ў цэлым: «Вядома, мы ўсе знервавaліся, калі «Дынама-Мінск» прайграла «Зеніту» з такім буйным лікам і не здолела прайсці далей, але ў суботу нацыянальная зборная правودзіць першы матч на стадыёне «Дынама». Я запрашаю ўсіх заўзятараў прыйсці і падтрымаць нашу нацыянальную зборную ў вельмі важным для нас турніры, у Лізе нацый, якая сапраўды дае магчымасць беларусам, прайшоўшы не вельмі складаны адбор у звычайнай групе на чэмпіянат Еўропы, прысутнічаць у якасці ўдзельніка гэтых спаборніцтваў», — дадаў Сяргей Румас.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

■ На варце кібербяспекі

# ВЫРАСЛА КОЛЬКАСЦЬ ЗЛАЧЫНСТВАЎ У СФЕРЫ ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Пра гэта паведаміў журналістам старшыня Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь Іван НАСКЕВІЧ па выніках нарады ў кіраўніка дзяржавы, на якой было далажана пра стан злачыннасці ў краіне.**

У пачатку рабочай сустрэчы Аляксандр Лукашэнка папрасіў Івана Наскевіча выкласці ў агульных рысах сітуацыю, якая склалася ў рабоце Следчага камітэта. Беларускі лідар адзначыў, што пільна сочыць за работай ведамства.

Другое пытанне — крымінальныя справы, якія знаходзяцца на кантролі ў Прэзідэнта. «Як ідзе следства па гэтых крымінальных справах? — запытаў кіраўнік дзяржавы. — Ці ўсё там сумленна, аб'ектыўна і справядліва?»

Акрамя таго, Прэзідэнт папрасіў выкласці сітуацыю пра ўзаемаадносіны Следчага камітэта з расійскімі калегамі.

Журналістам Іван Наскевіч паведаміў лічбы, якія былі агучаны Прэзідэнту: за восем месяцаў бягучага года ўзровень злачыннасці ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года знізіўся на 3 %, прыкладна на 6 % зменшылася колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, забойстваў — прыкладна на 5 %.

Па словах кіраўніка Следчага камітэта, змянілася структура злачынстваў: на 70 % у параўнанні з мінулым годам вырасла колькасць парушэнняў закона ў сферы высокіх тэхналогій. Прычыны ў тым, што стала больш сродкаў камунікацый — ноўтбукаў, планшэтаў, тэлефонаў, а таксама ў невысокім узроўні прававой культуры людзей. Разам з тым у праваахоўнікаў з'явілася новая тэхніка і магчымасці. У астатнім, дадаў ён, структура злачыннасці тая ж, што і ў мінулыя гады.

Акрамя таго, Іван Наскевіч інфармаваў Аляксандра Лукашэнку пра рэзанансныя справы, якія знаходзяцца на кантролі ў Прэзідэнта. У прыватнасці, пра крымінальную справу па факце гібелі радавога Аляксандра Коржыча, судовае следства па якім праводзіцца ў цяперашні час. «Не прадвызначаючы рашэнне суда, мною далажана аб усіх абставінах справы, аб прычынах і ўмовах, якія спрыялі гэтаму выпадку», — растлумачыў ён.

Таксама Прэзідэнт заслухаў справаздачу па справах карупцыйнай накіраванасці. Асобную ўвагу кіраўнік дзяржавы надаў пытанням расследавання крымінальных спраў мінулых гадоў, асабліва — забойстваў. Па словах Івана Наскевіча, з улікам новых магчымасцяў крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз штогод да дзесяці крымінальных спраў па фактах забойстваў мінулых гадоў накіроўваецца ў суд.

Кіраўнік дзяржавы быў праінфармаваны, што матэрыял праверкі па факце гібелі дзіцяці пасля прышчэпкі ў Ганцавіцкім раёне прыняты ў вытворчасць галоўным следчым упраўленнем цэнтральнага апарату СК. Высвятляецца прычына смерці, акрамя таго, следчыя звернуць увагу на пытанні закупкі гэтай вакцыны. Аляксандр Лукашэнка даручыў Івану Наскевічу ўзяць гэтую справу пад персанальны кантроль. «Высновы яшчэ рабіць, вядома ж, заўчасна. Нават аб прычынах смерці можна пакуль толькі ў меркаваным варыянце весці размову. Заключэнне экспертаў мы яшчэ не атрымалі», — дадаў кіраўнік СК.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Японія хоча павысіць пенсійны ўзрост



Японія, самая ўзроставая краіна ў свеце, задумалася над пенсійнай рэформай. Прэм'ер-міністр Сіндза Абе прапануе японцам выходзіць на пенсію пасля 70 у абмен на павышаныя выплаты.

Сіндза Абе ўзначальвае ўрад ужо шэсць гадоў, і ў верасні ён, хутчэй за ўсё, атрымае яшчэ адзін трохгадовы мандат. Гэты тэрмін ён хоча скарыстаць для рэформы сацыяльнай сферы і вырашэння галоўнай праблемы краіны — дэмаграфічнай, піша вядучая японская газета Nikkei.

За час яго праўлення эканоміка Японіі вырасла больш чым на 8 %, нягледзячы на імклівае старэнне і скарачэнне насельніцтва. Шмат у чым гэта стала магчымым дзякуючы ўключэнню пенсіянераў у эканоміку: калі ў 2012 годзе сярод занятых працай доля людзей старэйшых за 65 гадоў не перавышала 20%, то цяпер яна складае 23,5 %.

Гэтую тэндэнцыю трэба замацаваць і развіваць, лічыць Абе. Ён хоча дазволіць японцам адмаўляцца ад пенсійных выплат і пасля 70 гадоў, але затое потым атрымліваць больш.

## Кіраўнік МУС ФРГ назваў пытанне міграцыі «крыніцай усіх палітычных праблем» у краіне

Міністр унутраных спраў ФРГ Хорст Зеехофер лічыць, што падзенне рэйтынгаў вядучых нямецкіх партый, у тым ліку кансерватыўнага блока ХДС/ХСС, звязана з праблемай міграцыі. Пра гэта ён заявіў у апублікаваным у чацвер інтэрв'ю газеце Rheinische Post.

«Пытанне міграцыі — гэта крыніца ўсіх палітычных праблем у краіне, я паўтараю гэта ўжо тры гады, і гэта пацвярджаюць многія апытанні», — адзначыў Зеехофер.

«У нас упершыню з'явілася партыя «больш правая, чым ХДС/ХСС», якая можа ў сярэднетэрміновай перспектыве ўмацаваць свае пазіцыі. Мы маем расколатую краіну і недастатковую падтрымку народных партый у грамадстве», — сказаў ён, гаворачы пра ўзмацненне на палітычным небасхіле ФРГ правапапулісцкай «Альтэрнатывы для Германіі». Па словах Зеехофера, многія немцы звязваюць свае сацыяльныя асцярогі з міграцыйным пытаннем.

Кіраўнік МУС таксама адзначыў складанасці пры пошуку агульнаеўрапейскага вырашэння праблемы бежанцаў. «Возьмем, напрыклад, пагадненне з Італіяй: за кожнага бежанца, якога вяртаем, мы павінны ўзяць іншага. Гэта гульня з нулявым вынікам, гэта, праўда, спрые ўсталяванню парадку, але не абмежаванні міграцыі», — лічыць ён.

## WP: у адміністрацыі ЗША шукаюць аўтара артыкула аб «руху супраціўлення» ў Белым доме

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп і яго памочнікі прыступілі да пошукаў аўтара артыкула ў газеце The New York Times, супрацоўніка амерыканскай адміністрацыі высокага рангу, які напісаў пра «рух супраціўлення» ў Белым доме. Пра гэта паведаміла газета The Washington Post.

Па звестках выдання, артыкул выклікаў у прэзідэнта приступ «вулканічнага гневу» і «прывёў яго ў бязмерную лютасць». Ён расцаніў артыкул як здраду і паведаміў даверaным асобам, што падазрае супрацоўнікаў, якія займаюцца пытаннямі нацыянальнай бяспекі або якія працуюць у Міністэрстве юстыцыі. Артыкул уразіў шмат каго з супрацоўнікаў Белага дома, адзначае WP, яны адмянілі свае працоўныя сустрэчы і заняліся пошукамі яго аўтара. Памочнікі аналізуюць моўныя канструкцыі, якія выкарыстоўваліся ў матэрыяле газеты, каб паспрабаваць распазнаць асобу аўтара ці хаця б высветліць ведамства, дзе ён працуе.

Па словах крыніцы газеты, «праблема прэзідэнта складаецца ў тым, што многія людзі» ў яго адміністрацыі маглі б напісаць гэты артыкул.

Выданне Politico са спасылкай на свае крыніцы паведаміла, што матэрыял у NYT прывёў да «сапраўднага калапсу» ў адміністрацыі.

■ Медыяпрастора

# Сяброўства: кніжная матэрыялізацыя

**Пра тое, як можна «любіць Беларусь нашу мілую», раскажуць выдаўцы і дзеячы культуры краіны на XXXI Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая праходзіць днямі ў павільёнах ВДНГ. Гэта маштабны агляд кніжнай прадукцыі 25 краін-удзельніц.**

Нацыянальны павільён Беларусі раскрывае сутнасць Года малой радзімы. Літаратура, якая распавядае пра нашу радзіму, кнігі па краязнаўстве і выданні, якія дапамогуць тым, хто захоча прыехаць да нас у госці, — на гэта зроблены, паводле **міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандра КАРЛЮКЕВІЧА**, акцэнт сёлета. Але тыя, хто завітаюць у павільён, знойдуць самыя розныя выданні, што даюць магчымасць зразумець кніжную палітру Беларусі дзякуючы гандлёваму прадпрыемству «Белкніга». З навінкамі айчынных выдавецтваў таксама можна пазнаёміцца гэтымі днямі ў Маскве: досвед папярэдніх удзелаў беларускай дэлегацыі сведчыць пра цікавасць да экспазіцыі з боку нашых землякоў, якія жывуць у Расіі.

Дарэчы, з творамі беларускіх пісьменнікаў сёння можна знаёміцца на розных мовах свету — і гэта адна з тых разынак, чым уражвае Нацыянальны павільён краіны на Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы. Таму невыпадкова, што ў дні работы выстаўкі вакол беларускай дэлегацыі гуртуюцца сябры-пісьменнікі: у Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі адбыўся круглы стол на тэму «Літаратурнае пабрацімства: традыцыі ўзаемных перакладаў». Яго арганізатарамі сталі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура». У размове ўдзельнічалі беларускія і расійскія пісьменнікі і рэдактары літаратурна-мастацкіх часопісаў.

Гэтым разам размова была падмацаваная матэрыяльнымі прыкладамі супрацоўніцтва, якое з расійскім бокам іздзе вельмі актыўна, у тым ліку дзякуючы нашым землякам, якія жывуць у суседняй краіне. Напрыклад, паэтэса і літаратурны крытык Любоў Турбіна стала аўтарам зборніка «Людзі на балоце. Экалогія як дамінанта беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя», які быў выдадзены ў Маскве. Але ў Мінску выйшаў зборнік апавяданняў «У добрыя рукі» расійскай пісьменніцы Алены Тулушавай у перакладзе на беларускую Уладзіміра Саламахі. Творы беларускіх паэтаў выходзяць у перакладах народнага паэта Татарстана Рэната Харыса і Юрыя Шчарбакова, што жыве ў Астрахані. А розныя беларускія выдавецтвы апошнім часам усё больш выдаюць перакладныя кнігі літаратуры народаў Расіі (Татарстана, Чувашыі, Башкірыі, Чачні, Дагестана) і іншых краін. Калі выдаюць — значыць, гэта патрэбна.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Традыцыйныя СМІ прымаюць лічбавы выклік

**На наступным тыдні Мінск і сталічны рэгіён прымуць Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні: лічбавая павестка для медыяпрасторы». Прафесійны кангрэс, які праводзіцца ў нашай краіне з 2006 года, сёлета пройдзе з 11 па 14 верасня і збярэ больш як 300 кіраўнікоў СМІ, палітолагаў і сацыёлагаў, медыяэкспертаў як з Беларусі, так і з некалькіх дзясяткаў краін СНД, блізкага і далёкага замежжа — напрыклад, упершыню на форуме будуць прадстаўленыя Манголія, В'етнам і Бангладэш.**

«Асноўнай тэмай форуму стане лічбавізацыя медыяпрасторы і ўкараненне новых тэхналогій медыяменеджменту, якое мы назіраем фактычна штодзённа, прыход у журналістыку новых фарматаў, методык і падыходаў. Акрамя таго, на парадку дня — абмеркаванне тэмы захавання традыцыйных СМІ ва ўмовах каласальнага ціску з боку сацыяльных сетак і медыя, — адзначыў **першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Павел ЛЁГКІ**. — Мы хацелі б дасягнуць большай практыка-арыентаванасці, каб форум стаў пляцоўкай для абмену вопытам, якая дазваляе журналістам (і асабліва гэта датычыцца журналістаў рэгіянальных СМІ) атрымаць новыя, сучасныя веды ў прафесійнай сферы».

Асноўнымі мерапрыемствамі форуму стануць пленарнае пасяджэнне і работа чатырох тэматычных секцый: «Інтэрнэт-рэсурсы як эфектыўны інструмент фарміравання грамадскай думкі», круглы стол «Саюзная дзяржава ў эпоху новых медыя: стратэгія пазіцыянавання», «Тэлебачанне і новыя сеціўныя тэхналогіі: выклікі або новыя магчымасці», «Лічбавізацыя медыяпрасторы: новае аблічча традыцыйных СМІ», у межах якіх адбудуцца прафесійныя дыскусіі і абмен практычным вопытам.

Дыскусіі абяцаюць быць гарачымі, заўважыў **саветнік аналітычнага аддзела інфармацыйна-аналітычнага дэпартамента Выканкама СНД Ігар ЗЕЛЯНКЕВІЧ**, бо праблемы, якія спарадзіла развіццё лічбавай медыяпрасторы, надзвычай актуальныя і вострыя: гэта і распаўсюджанне фэйкавых навін, і размяшчэнне ў сеціўных медыя зневажальных каментарыяў, якія могуць закранаць інтарэсы як пэўнай сацыяльнай групы, так і агульнадзяржаўныя, і засмечванне інфармацыйнай прасторы запазычанымі словамі, а значыць, збядненне ўласнай мовы... «Ні ў якім выпадку не заклікаю да вяртання цэнзуры, але, на мой погляд, наспеў час для распрацоўкі пэўнай журналісцкай канвенцыі, якая вырашала б гэтыя праблемы і ставіла інфармацыйную заслонуняпраўдзе», — дадаў Ігар Зелянкевіч.

Яшчэ адзін з важных пунктаў праграмы — Летняя школа журналістыкі, у якой па традыцыі праводзяць майстар-класы і тэматычныя лекцыі «гуру» беларускіх і замежных СМІ.

**Вікторыя ЗАХАРАВА** ■

■ Аты-баты

## ПАЧАЛІСЯ МАШТАБНЫЯ ВУЧЭННІ

**У Беларусі распачалося каманднa-штабное вучэнне. У ім задзейнічана да 7,5 тысячы вайскоўцаў, 260 адзінак бронетэхнікі, каля 30 самалётаў і верталётаў. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.**

Тэмай вучэння абрана падрыхтоўка і прымяненне войскаў у інтарэсах адбіцця агрэсіі супраць нашай краіны. Тэма вызначана з улікам новых выклікаў і пагроз ваеннай бяспецы, якія ўзнікаюць у свеце.

Вучэнне будзе праходзіць у два этапы. Яго мэта — праверыць узровень навучанасці органаў кіравання, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў і іх здольнасць кіраваць сіламі і сродкамі пры выкананні задач па прызначэнні.

Вайскоўцы задзейнічаюць вучэбна-матэрыяльную базу шасці палігонаў, а таксама раёны і ўчасткі мясцовасці ў Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях.

Вучэнне скончыцца 12 верасня.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК** ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## 13 ЖЫХАРОЎ СТАЛІЦЫ БУДУЦЬ УЗНАГАРОДЖАНЫ ВЫСОКІМ ЗВАННЕМ

**Напярэдадні Дня горада вызначыліся лаўрэаты конкурсу «Мінчанін года», паведамілі ў прэс-службе сталічнай мэрыі.**

За высокія дасягненні ў працы, асаблівы асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Мінска ганаровага звання сёлета ўдастоены 13 чалавек, якіх выбралі са 118 прэтэндэнтаў. Цырымонія ўшанавання лаўрэатаў адбудзецца 8 верасня ў гарадскім Палацы культуры.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

## НЕБЯСПЕЧНЫЯ АПТЭЧКІ Ў БАМБАСХОВІШЧЫ

**У Мінску праваахоўнікі ў бамбасховішчы, што дэмантуецца і знаходзіцца на тэрыторыі аднаго з заводаў, былі выяўлены індывідуальныя аптэчкі «АІ-2».**

У іх утрымліваўся лекавы прэпарат «Тарэн», які з 2009 года ўключаны ў спіс прэпаратаў, што змяшчаюць псіхатропныя рэчывы. Усяго канфіскавана каля 1000 таблетак, паведамілі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама. Як вядома, пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 31.07.2009 года ў спіс прэпаратаў, якія змяшчаюць псіхатропныя рэчывы, уключаны таблеткі «Тарэн», якімі ўкамплектаваны індывідуальныя аптэчкі «АІ-2», пастаўленыя ў 1980—1990 гады ва ўсе прадпрыемствы і арганізацыі па лініі грамадзянскай абароны ў якасці сродкаў хімабароны.

## У ПАЛІКЛІНІЦЫ ЗНАЙШЛІ РТУЦЬ

**У Наваполацку ратавальнікі правялі дэмеркурызацыйныя работы ў будынку лячэбнай установы: у паліклініцы па вуліцы Блахіна выявілі ртуць.**

Вадкі метал знайшлі ў службовым кабінеце стаматалагічнага аддзялення. Гаворка ішла пра 30 грамаў ртуці. Высветлілася, што яе заўважыў загадчык гаспадаркі пры правядзенні рамонтных работ па замене каналізацыйнага трубаправода, пра што ён і паведаміў у МНС. Работнікамі аддзялення хімічнай і радыяцыйнай аховы ртуць была сабрана і дастаўлена для ўтылізацыі. Па інфармацыі МНС, пагрозы жыццю і здароўю людзей няма.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# БУДЗЕМ З БУЛЬБАЙ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таццяна Карбановіч кажа, што асноўныя віды прадукцыі ў спецыялізаваных сховішчах сельскагаспадарчых арганізацый захоўваюцца да новага ўраджаю. У мінулым годзе на экспарт рэалізавана 391 тысяча тон бульбы, 366 тысяч тон агародніны і 33 тысячы тон садавіны. Падобна на тое, што ў гэтым сезоне за мяжу мы прададзім яшчэ больш.

## Буякі, журавіны, вінаград...

Паводле слоў спецыяліста Мінсельгасхарча, пакуль айчынныя вытворцы не ў поўнай меры забяспечваюць патрэбнасці рынку ў яблыках і іншай садавіне, а таксама ягадах. У краіне прынята праграма, якая прадугледжвае развіццё пладаводства і аграрнага бізнесу. У тым ліку вытворцам аказваецца дзяржаўная падтрымка. Штогод у краіне плануецца закладка 500 га садоў. Сёлета вясной саджанцы ўжо высаджаны на плошчы каля 100 га. Асноўныя пасадкі запланаваны на восень.

Дзяржаўная падтрымка аказваецца на конкурснай аснове, у гэтым годзе пераможцамі конкурсаў сталі 35 арганізацый. За кошт плоданашэння маладых садоў, як чакаецца, да 2020 года вытворчасць пладова-ягаднай прадукцыі павялічыцца да 160 тысяч тон. У апошнія гады ў краіне пашыраюцца плантацыі такіх культур, як буякі, аронія, журавіны і вінаград.

## ...і кавуны



Фота БелТА.

Бахчавыя культуры мы на прамысловай аснове сталі вырошчваць досыць нядаўна. Сёлета кавуны былі высаджаны на плошчы каля 26 гектараў, асноўныя ўчасткі размешчаны ў Брэсцкай, Гродзенскай, Гомельскай і Мінскай абласцях. Аграрыі разлічваюць атрымаць ураджай не меншы за мінулагодні — каля 500 тон. Ужо сабрана каля сямі тон.

## Валюта і самім патрэбна

Сёлета сталі менш закупляць за мяжой агародніны і садавіны, паведаміла **намеснік начальніка аддзела спажывецкага рынку Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Таццяна КРАСНЮК.** А ў выніку ў I паўгоддзі ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года імпарт бульбы скараціўся на 54 %, цыбулі і часнаку — на 79 %, таматаў — на 41 %, капусты — на 34 %, агуркоў — на 29 %, яблыкаў — на 64 %.

Удзельная вага продажу беларускай агародніны і грыбоў у студзені — чэрвені склала 70,4 %. Па некаторых пазіцыях гэтая доля значна вышэйшая. Так, каля 91 % рэалізуецца ў гандлёвай сетцы цыбулі айчыннай вытворчасці, тады як летась — толькі 61 %, яблыкаў — 20 % (плюс 4 %). Міністэрства трымае на кантролі пытанні пастаўкі ў крамы айчыннай прадукцыі. Праводзіцца маніторынг гандлёвых аб'ектаў.

Таццяна Краснюк нагадала, што ўвосень ва ўсіх рэгіёнах краіны пройдуць сельскагаспадарчыя кірмашы. Сезон стартуе з 15 верасня, а ўжо з 22 верасня абавязкова арганізуюцца кірмашы выхаднога дня. Акрамя таго, вытворцам у гарадах вылучаюцца пляцоўкі для рэалізацыі агародніны і садавіны. Так, у Мінску на 16 рынках арганізавана каля трох тысяч месцаў, дзе гаспадаркі, фермеры, фізічныя асобы, прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі могуць рэалізоўваць сваю прадукцыю. Пенсіянерам і інвалідам такая паслуга аказваецца бясплатна.

Эксперт агучыла лічбы, якія характарызуюць густы беларусаў у ежы. Па спажыванні бульбы на душу насельніцтва мы займаем першае месца сярод краін постсавецкай прасторы — 171 кг штогод. Напрыклад, ва Украіне і Расіі гэтыя лічбы складаюць 140 кг і 113 кг адпаведна. Што датычыцца бахчавых культур і агародніны, прадуктаў іх перапрацоўкі, то краіна тут займае пятую пазіцыю. Кожны беларус спажывае ў год 146 кг такой прадукцыі. А вось па садавіне мы недацягваем — 90 кг пры норме 98,6 кг.

## Ягады збіралі цэлымі вёскамі

Белкаапсаюз сёлета закупіў у насельніцтва ў сем разоў больш чарніц, чым летась, паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення нарыхтовак рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў Юрый САКАЛОЎСКІ.**

Толькі чарніц было нарыхтавана 1,8 тысячы тон. Зараз арганізавана закупка журавін, дурніц і грыбоў, а таксама яблыкаў. У сярэднім, па словах Юрыя Сакалоўскага, Белкаапсаюз у год закупляе сельскагаспадарчай прадукцыі і дзікарослай сыравіны на 250—300 млн, у тым ліку ў насельніцтва — на 120—150 млн рублёў. Перад пачаткам сезона праводзяцца сустрэчы з фермерамі ў абласцях, вызначаюцца аб'ёмы і віды прадукцыі, абмяркоўваюцца пытанні цэнаўтварэння.

— За восем месяцаў ужо закупілі прадукцыі на 200 мільёнаў рублёў, у тым ліку ў насельніцтва — на 110 мільёнаў. Закупляем па цэнах, сфарміраваных рынкам, зыходзячы з попыту і прапановы, — адзначыў Юрый Сакалоўскі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЦІ ХАПАЕ Ў ОРШЫ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Оршабудматэрыялы» шукае токара і фрэзероўшчыка (і той, і той на паўстаўкі за 250 рублёў у месяц), кіроўцу пагрузчыка (ад 500 рублёў) і падсобных рабочых. Камбінату хлебапрадуктаў патрабуюцца трактарысты-машыністы, кіроўца аўто, слесар-рамонтнік. Для тых, у каго няма кваліфікацыі, адкрыта вакансія грузчыка — з заробкам у 350 рублёў.

Прадпрыемства «Орша-Сэрвіс» аб'ядноўвае сетку крам і кавярняў. Гатовы ўзяць прыбіральшчыка і кухара ў школьную сталовую.

— Бяром і тых, хто быў на навучанні ад цэнтра занятасці, — тлумачыць кадравік па апошняй вакансіі. — Яны праходзяць практыку, потым ужо глядзім, ці пакінем. Вядома, кандыдат мусіць быць без шкодных звычак: побач жа дзеці.

Сюды ж неабходны прадавец чацвёртага разраду — пажадана жанчына, бо калектыў жаночы.

Інжынеры-энергетыкі патрэбны на спецаўтабазу. З вышэйшай тэхнічнай адукацыяй і вопытам працы па прафесіі. «Вядучага спецыяліста ўжо паўтара месяца шукаем», — заўважаюць на прадпрыемстве. Заробак на гэтай пасадзе — 575 рублёў.

Спецкамбінат, які аказвае рытуальныя паслугі, шукае прыбіральшчыка тэрыторыі. Работа, скажам так, спецыфічная, бо працаваць давядзецца на могілках, якіх на балансе прадпрыемства больш за 200.

У Аршанскай цэнтральнай паліклініцы патрэбу ў сярэднім медперсанале нядаўна закрылі: набралі маладых спецыялістаў. А вось дактароў па-ранейшаму не хапае. Калі казаць пра аплату, то «голы» аклад акушэра-гінеколага, напрыклад, складае 412 рублёў. Медсёстры з улікам усіх надбавак маюць каля 450 рублёў у месяц.

На кірмашы вакансій прысутнічаў і прадстаўнік Аршанскага інструментальнага завода — таго самага, чый стан нядаўна жорстка раскрытыкаваў Прэзідэнт.

— Вы ведаеце, што завод цяпер у стадыі мадэрнізацыі, ідзе рамонт, але вытворчасць не стаіць, — адзначаюць на прадпрыемстве. — Нам патрэбны гатовыя спецыялісты, трэці разрад і вышэй — шліфоўшчыкі, фрэзероўшчыкі, інжынер-тэхнолаг. Навучанне пакуль не праводзім, да новага года не будзе магчымасці.

Заробкі абяцаюць невялікія. Работнікі са стажам, кваліфікацыяй атрымліваюць па 500—600 рублёў, пачаткоўцы, вядома, значна менш. На прадпрыемстве прызнаюцца: са спецыялістамі бяда (з улікам умоў працы відавочна, чаму).



— Сёлета ў навучальныя ўстановы 22 заяўкі падалі — толькі 12 закрылі, і тое на сёння з іх засталіся чатыры чалавекі: астатнія будуць далей вучыцца.

**«Гатовы рвануць у Маскву»**

Па афіцыйнай статыстыцы, сярэдні заробак у раёне за ліпень склаў 795 рублёў. У сельскай, лясной і рыбнай гаспадарках плацяць 743 рублі, у прамысловасці — 800, у будаўніцтве — 618, у аптовым і рознічным гандлі — 731, у сферы транспарту — 1217. У галіне адукацыі сярэдні заробак — 558 рублёў, ахове здароўя — 666, творчасці, спорту, забаў, адпачынку — 481.

Але, па назіраннях гараджан, даходы куды больш сціплыя.

— Практычна ўсе мае знаёмыя атрымліваюць ад 400 да 500 рублёў, — дзеліцца Валянціна. Сама яна ў пошуках работы ўсяго тыдзень, дагэтуль працавала прыёмнай маці — за мінімалку.

— Дзіця было вельмі складанае, — успамінае жанчына. — Другога ўзяць ужо не змагу. Адбылося прафесійнае выгаранне.

Па адукацыі Валянціна настаўнік пачатковых класаў. Але па спецыяльнасці працавала даўно, таму трэба перавучвацца. «А мне 50 гадоў, ужо мазгі не тыя і праграма змянілася цалкам».

Жанчына думала ўладкавацца выхавальніцай у групу прадоўжанага дня — там не аказалася месцаў. У цэнтры занятасці прапанавалі перавучыцца на кухара, але гэта не яе — Валянціне было б больш па душы мець справу з раслінамі ці жывёламі.

Яшчэ адна мясцовая жыхарка, інжынер-тэхнолаг харчовай вытворчасці з вопытам, 15 месяцаў не можа знайсці працу. Кажа, у асноўным трапляюцца «мужчынскія» вакансіі — інжынер па метале, інжынер-электрык. Яе сітуацыю ўскладняе яшчэ і нядаўна атрыманая група інваліднасці.

— А заробкі абяцаюць мізэрныя! — абураецца Алена. — Максімум 500 рублёў — гэта пры высокай кваліфікацыі і вялікім стажы. А на некаторых прадпрыемствах і яшчэ менш, 300 рублёў — нават няма сэнсу хадзіць на такую работу.

Праўда, дадае яна, ёсць у раёне арганізацыі, дзе добра плацяць. Напрыклад, «Белтэлекам», «Легмаш», чыгунка. Але шмат моладзі ўсё роўна з'язджае на заробкі — у краіны Прыбалтыкі, Польшчу.

На першым паверсе адзін з мужчын вывучаў стэнд з вакансіямі. Цікавіўся прапановамі для тынкоўшчыкаў.

— Хоць бы 500 рублёў прапаноўвалі! Мне ж многа не трэба, дзеці ўжо дарослыя, сябе толькі забяспечыць.

Цяпер мужчына падпрацоўвае ў прыватніка, але, калі што, гатовы «рвануць у Маскву».

**Падабраць вакансіі ўсім**

Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Аршанскага райвыканкама Наталлі ДРАЗДОВАЙ**, сітуацыя на рынку сёлета палепшылася. Усяго за студзень-жнівень па садзейнічанне ў пошуку работы да спецыялістаў звярнуліся 4128 чалавек (з іх 1776 былі зарэгістраваны ў якасці беспрацоўных). Амаль 70 працэнтам змаглі падабраць вакансіі. На перанавучанне адправілі 6,8 % грамадзян — кожнага чацвёртага з іх рыхтавалі пад заказ наймальніка. Яшчэ 22 жыхарам раёна выдалі субсідыю на арганізацыю прадпрымальніцкай дзейнасці, 7 — на адкрыццё рамесніцкай справы.

На пачатак верасня на ўліку ў якасці незанятых стаяла 403 чалавекі — гэта амаль на палову менш, чым было год таму. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя складае 0,6 працэнта. Ледзь не кожны другі, хто афіцыйна не мае работы, скончыў толькі школу. З вышэйшай адукацыяй — дзясятая частка беспрацоўных.

У Оршы знаходзяцца дзве папраўчыя калоніі. Але ў цэнтры занятасці тлумачаць, што ім не так часта даводзіцца мець справу з былымі асуджанымі: пасля вызвалення тыя з'язджаюць па месцы прапіскі. Так, з пачатку года ў раёне было працаўладкавана 14 чалавек, якія выйшлі з папраўчых устаноў. Вакансіі розныя: забойшчык жывёлы, трактарыст-машыніст, швачка, падсобныя рабочы.

— У асноўным гэта некваліфікаваная праца. Нават калі ў былых асуджаных ёсць спецыяльная адукацыя, то стаж невялікі, — каментуюць па ўпраўленні. — І, вядома, у гэтай катэгорыі часта няма жадання працаваць. Рэгіструюцца ў нас, каб атрымаць матэрыяльную дапамогу, а не садзейнічанне ў пошуку работы.

Служба занятасці стараецца наладзіць кантакт беспрацоўных з аддзеламі кадраў прадпрыемстваў. Нават калі там цяпер няма вакансій, магчыма, у будучыні з'явяцца прапановы.

...Падчас нядаўняга візіту сюды кіраўніка краіны губернатар Віцебскай вобласці Мікалай Шарснёў адзначыў, што акцэнт у развіцці будзе рабіцца на тыя раёны, якія валодаюць асноўнай працоўнай сілай. Сярод іх — і Аршанскі. Гэта актуальнае пытанне не толькі для занятасці, але і для напаўняльнасці бюджэту. Сёння датацыі Аршаншчыны раўняюцца суме датацый дзесяці раёнаў.

Тады ж губернатар паведамляў, што ў вобласці падрыхтавана спецыяльная праграма, якая мае на ўвазе рэалізацыю інвестыцыйных праектаў у кожным раёне на агульную суму каля 6,5 мільярда рублёў. Па падліках, гэта дапаможа працаўладкаваць прыкладна палову незанятых у эканоміцы грамадзян. Прадугледжваецца стварэнне новых прадпрыемстваў, развіццё сферы турызму, лесанарыхтовак і дрэваапрацоўкі, будаўніцтва транспартна-лагістычных цэнтраў. Абяцаюць таксама стварыць дадатковыя прывабныя ўмовы для моладзі, каб тая не імкнулася з'язджаць з малых населеных пунктаў і райцэнтраў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ,**
*г. Орша.*

## Зважай

# Пра вызваленне — у сацсетках

**Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны аб'яўляе адметную акцыю ў сацыяльных сетках.**

23 верасня спаўняецца 75 гадоў з дня пачатку вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гэты дзень у 1943-м быў вызвалены першы раённы цэнтр рэспублікі — гарпасёлак Камарын Палескай вобласці. Падчас наступальных аперацый восенню і зімой 1943—1944 гадоў удалося скаваць сілы групы армій «Цэнтр», нанесці вялікія страты ворагу і вызваліць 36 раённых і 2 абласныя цэнтры — Гомель і Мазыр. Савецкія войскі занялі выгадныя пазіцыі, з якіх улетку 1944 года пачалася пераможная беларуская наступальная аперацыя «Баграціён».

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запрашае айчынныя і замежныя музеі, а таксама архівы і бібліятэкі 23 верасня ўзяць удзел у акцыі «Вызваленне Беларусі», прымеркаванай да юбілейнай даты. Удзельнікам прапануецца на працягу дня на старонках у сацыяльных сетках публікаваць інфармацыю аб сваіх экспанатах і музейных прадметах, дакументах, фотаздымках і іншых матэрыялах, звязаных з вызваленнем Беларусі. Таксама арганізатары запрашаюць падтрымаць акцыю ўсіх ахвотных, чые сямейныя архівы захоўваюць памяць аб гэтай старонцы гісторыі.

Як заўважылі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, публікацыі могуць быць прысвечаны асноўным датам і эпізодам вызвалення, яго ўдзельнікам, гістарычнай памяці. Запісы варта пазначаць тэгамі #ОсвобождениеБеларуси75 і #BelarusLiberation75. Вітаюцца спасылкі на акаўнты Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны як ініцыятара акцыі: «УКантакце» — vk.com/warmuseumby, «Фэйсбук» — facebook.com/warmuseumby, «Інстаграм» — instagram.com/warmuseumby

## Надвор'е

# А Ў НАС ЯШЧЭ ЛЕТА

## Тэмпературны фон гэтых дзён на 3-8 градусаў перавышае норму

**Другі тыдзень верасня працягвае радаваць нас камфортным летнім надвор'ем. Гэтак жа цёпла і суха чакаецца ў нашай краіне і ў выхадныя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А сёння надвор'е ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў цёплым паветры. Чакаецца невялікая воблачнасць, будзе ў асноўным без ападкаў. Вецер прагназуецца ўсходні ўмераны. Максімальная тэмпература паветра ў другой палове дня будзе дасягаць ад плюс 21 да плюс 27 градусаў.

На гэтых выхадных надвор'е будзе вызначаць у асноўным вобласць павышанага атмасфернага ціску ад шырокага антыцыклону, які атабарыўся над еўрапейскай часткай Расіі. Разам з ім да нас прыйдзе цёплая паветраная маса. У Белгідрамецэ спецыяльна адзначылі, што прырода парадуе мінчан і гасцей сталіцы цудоўным летнім сухім надвор'ем у Дзень горада. У суботу па краіне чакаецца пераменная воблачнасць. Будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і днём у асобных раёнах па крайнім поўдні краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Вецер прагназуецца ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, днём стане значна цяплей — 20—26 градусаў вышэй за нуль.

Пераважна без ападкаў будзе і ў нядзелю. Вось толькі ўначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Вецер прагназуецца ўсходні, паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—15 цяпла, а днём сонца прыгрэе ад плюс 21 да плюс 27 градусаў. Згодна з папярэднім прагнозам айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня атмасферны ціск пачне павольна зніжацца. З'явіцца больш аблокаў, паступова наблізіцца да нашых рэгіёнаў франтальныя падзелы, пачнуцца дажджы. Тэмпературны фон панізіцца. Магчыма, да сярэдзіны месяца ён вернецца да кліматычнай нормы, адзначылі ў Белгідрамеце.

І яшчэ. Цёплыя ў першыя дні восені бывае не так часта: за апошнія 70 гадоў гэта трэці раз. Вада на рэках і вадаёмах краіны добра падаграваецца: па звестках гідролагаў, яе тэмпература цяпер у асноўным у межах ад 17 да 22 цыпла.

**Сяргей КУРКАЧ**




## ШТО ВЫРАСЦЕ, ТОЕ ВЫРАСЦЕ?

У тыя часы служба ў войску была справай гонару. Прызвалі хлопца — значыць, здаровы, ганьбы няма. «Продкі» маглі ганарыцца!

Так атрымалася, што іх, сваіх родных, Міша не ведаў: бацька сабакам сена касіў, маці, можна сказаць, таксама. Хлопчык гадаваўся ў бабулі. Значыць, яна і выправы спраўляла: сабрала якую-ніякую радню, суседзяў. Людзі старэйшыя больш сядзелі за сталом, моладзь ішла на танцы. У нашых мясцінах яны часта тады канчаліся бойкамі.

Вось і той раз бліжэй да раніцы завязалася нейкая спрэчка. Удзельнікаў паспрабаваў было спыніць, але... Так выйшла — «падкруціўся» ён пад Мішаў кулак, можна сказаць, пудовы. А далей — загадчыца клуба выклікала міліцыю і хуткую дапамогу. Першая машына забрала прызыўніка, другая — пацярпелага. А ў выніку замест войска Мішу «замялі» ў калонію, здаецца, у Рэспубліцы Комі, і вярнуўся ён адтуль гадоў праз дзесяць (некалькі, праўда, папрацаваў, каб зарабіць «пад'ёмных», бо ні бацькоў, ні бабулі да таго часу ўжо не было)... Добра, што хата яшчэ засталася, і Міша, трохі ў ёй прыбраўшыся, мог распачаць новае жыццё — недзе сумнае, а недзе і трохі смешнае.

...Справа ў тым, што ў вёску ён вярнуўся вясной — людзі бульбу якраз садзілі. Міша хацеў таксама, і яму нават пашчасціла: суседка-дачніца выставіла на вуліцу пакунак з насеннай: бярыце, маўляў, каму трэба.

Міша ўзяў.

Назаўтра ж за пуняй у зацішку падняў лапік дзірвану і са словамі «што вырасце, тое вырасце» пасадзіў — роўна 60 клубняў.

Потым не ленаваўся іх дагледзець: матычыў пустазелле, акучваў.

А вось з «каларадамі» ўжо не змагаўся — патрэбы не было. Уся вёска стагнала, што населі жукі, што аж чырвана ад іх, што ядуць бульбоўнік. А Міша толькі пасмейваўся: на яговых градках не было не тое што ніводнага крылатага, нават дарослай лічынкі!

Гэта гаспадара, вядома ж, цешыла, а што засмучала — бульба яго зусім не кусцілася: сцяблінкі танкаватымі дудкамі гнала ўверх.

Стаміўшыся думаць, чаму б гэта, Міша неяк спыніў паштальёнку.

— Можа, зайшлі б, — папрасіў жанчыну, — паглядзелі б на бульбу. Нейкая дзіўная... Новы сорт тут ці што?

Жанчына — ёй не ўпершыню — смела зайшла на падворак, глянула на градкі і як туды не скацілася:

— Ага, — рагатала, — сорт — навейшы за новы: зацвіце — ахнеш! Вось толькі есці не будзе чаго.

— Як гэта не будзе? — насцярожыўся Міша.

— А так: ты замест бульбы вяргінь насадзіў!

— ?!

— Жаніцца табе, хлопча, трэба, гаспадыню шукаць...

— З маёй біяграфіяй?

— З любой! А твая ж яшчэ толькі пачынаецца, праўда? — падбадзёрыла хлопца жанчына.

Так ці інакш, але Міша яе паслухаў: кветкі адразу ж скасіў — на ўсякі выпадак (не хапала, каб людзі да мянушкі «зэк» прыстакку «кветквод» прыляпілі), бульбай сваёю больш не хваліўся. А ўзімку ўжо яму чужую: жонка прывезла. У якасці пасагу.

**А. Верамей,**

*г. Магілёў.*

## СХЛУСІЎ? І НЕ РАЗ? ДЫК ХТО ТАБЕ ПАВЕРЫЦЬ?!

...Здарылася мне прысутнічаць на памінальным абедзе. Пахавалі старэйшыну роду бабу Люсю. Ёй за 90 было — доўгае жыццё. Родзічы па чарзе падымаліся з месцаў, нешта сваё ўспаміналі, плакалі... І, вядома ж, усміхаліся!

«Пра бабулю ўсе казалі праўду, — прызнаў нарэшце яе першы ўнук. — І гаспадыня яна — якіх пашукаць, і працаўніца, і добрая маці, а ўжо бабуля... Праўда, канфлікты з ёй у нас былі. І на роўным месцы — таксама.

Я вучыўся ў пятым класе, калі бабуля датэрмінова (даяркі мелі на гэта права) пайшла на пенсію. Але ж працавала яна ўсё роўна шмат: дзеці, сям'я, гаспадарка, грыбы-ягады, нарыхтоўкі...

вялічкі, лёгенькі, складны... Ну, такі, каб з ім і ў грыбы добра збегаць» (яна ўжо цяжкавата хадзіла, але ж думала яшчэ, што бегае), і бульбачкі калі абабраць».

Ножык я знайшоў хутка, на рынку ў райцэнтры. Кажу бабулі: «Давай грошы — куплю». А яна ў адказ (відаць, успомніўшы мае «подзвігі»): «Не, унучак... Давай мы з табой удваіх з'ездзім і купім».

Назаўтра ж яна стала збірацца ў горад. Хораша прыбралася. І грошы — я сам гэта бачыў — паклала ў свой стары кашалёк, яго — у сваю чаргу — у такі ж дагістарычны рыдыкюль.

І вось мы ўжо на рынку. Ножык бабулі яўна падабаецца. «Колькі просіш?» — пытае ў гандляра. Той называе цану. Бабуля не яе адразу ж згаджаецца, апускае руку ў сумачку і...

Я бачу, як мяняецца яе твар, бо кашалька там... няма, знік: ці па дарозе згубіўся, ці хто выцягнуў. Але ж факт застаецца фактам: ні кашалька, ні грошай, ні ножыка!

Я, помню, казаў ёй: «Такой бяды. Будзе свята, мы купім табе такі ж, нават лепшы! У падарунак».

Яна, здаецца, верыла мне і ў той жа час... не верыла. Быццам прадчувала, што гэтая страта яшчэ не апошняя.

У той год яна хварэла, ляжала ў раённай бальніцы і кожны дзень збі-


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пасля ўрокаў я часцяком забягаў да яе: калі падсілкавацца, калі дапамагчы, а калі...

Не так часта, як мне хацелася б, але гэта было — бабуля даставала грошы і адпраўляла мяне ў краму. Я купляў там хлеб, алей, макарону, мыла, усё, што загадвала, усё, што трэба было, — ёй. Але ж шмат чаго хацелася мне самому: тых жа пернікаў, цукерак, ліманаду. Грошай на гэта ў мяне не было.

Дык я да чаго дадумаўся: спачатку нешта з прысмакаў купляў для сябе, потым — і «паштучнае» (накшталт трох булак хлеба, двух батонаў, бутэлькі алею...) — па «заяўцы» бабулі, а нарэшце прасіў прадавачку, каб узважыла тога ж цукру (яго ды розныя крупы завозілі тады мяхамі і прадавалі на вагу)...

Такім чынам, у бабуліну торбачку альбо крамны пакет можна было ўсыпаць ці два кілаграмы цукру ці... паўтара, напрыклад, а то і меней — у залежнасці ад таго, колькі заставалася грошай.

Карацей, і воўк быў сыты, і козы цэлыя. Гэта як мне здавалася. А таму апетыты мае раслі і раслі. Аж да таго, што бабуля ўсё часцей стала непакоіцца: маўляў, неяк хутка цукар «з'еўся», скончылася груца, хоць зусім жа нядаўна купляла...

Урэшце, як і варта было чакаць, яна ўзяла бязмен, падчапіла на яго прынесены мною тавар і, вядома ж, пайшла ў краму «шукаць праўды», высвятляць, хто ж тут махлюе: прадавачка абвешвае любімага ўнука ці ўжо той...

Праўда была для яе нечакана, крыўда — вялікая і, можна сказаць, пажыццёвая, бо ў краму мяне больш ніколі не пасылалі...

Хоць патрэбы, вядома ж, былі, прычым самыя розныя. Неяк, напрыклад, бабуля папрасіла: «Награздзь мне, Андрэйка, ножык — не-

ралася дамоў. «Ты, унучак, прапалі ў печы, — папрасіла мяне, калі я праведваў, — працяплі маю хатачку».

(Тут трэба сказаць, што дочкі бабуліны — у тым ліку і мама — клікалі, бралі яе жыць да сябе, угаворвалі пераехаць — хоць на зіму. Бабуля адмаўлялася наадрэз, казала: «Я са сваёй хатачкі анікуды не паеду. У ёй і пamру».)

Дык вось. Выканаў я тую просьбу: прапаліў у печы.

А бабуля потым успомніла, што перад ад'ездам у бальніцу за дровамі схавала ад злодзеяў... грошы.

Яны, вядома ж, згарэлі, я не быў у тым вінаваты, але...»

Згодзен, мала ў гэтай гісторыі смешнага. А вось сумнага ды павучальнага, мне здаецца, шмат. Ва ўсякім разе, калі б не тыя «крамныя» фокусы, адносіны ўнука з бабуляй былі б куды цяплейшыя. А так...

Праўду кажучы: схлусіў і не раз? Дык хто табе паверыць?

**Валерый Гаўрыш,**

*г. Чавусы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж** чарговы напамін, што ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца — яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую. Вынікі будуць падведзены на пачатку наступнага года. Журы — і вялікае чытацкае пад старшынствам **спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны**, і маленькае рэдакцыйнае на чале з **першым намеснікам галоўнага рэдактара спадарыняй Наталляй Карпенкай** — працуе, гісторыі пошта прыносіць... Адзінае, дасылаючы іх, калі ласка, паведамляйце свае пашпартныя даныя і — на ўсякі выпадак — нумар тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі.

■ Неасабісты суб'ектыў



# ЦЯЖАР НЕРУХОМАСЦІ

Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

При приобретении Лота № 1 победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи следующего имущества: водомер горячей воды (инв. № 60033855) – 25,94 бел. руб. с увеличением на сумму НДС, водомер холодной воды (инв. № 60039504) – 25,94 бел. руб. с увеличением на сумму НДС, счетчик СЕ102 BYS6145AKV электрической энергии (инв. № 61692379) – 33,54 бел. руб. с увеличением на сумму НДС.
При приобретении Лота № 2 победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи следующего имущества: водомер (счетчик горячей воды) (инв. № 61692577) – 60,25 бел. руб. с увеличением на сумму НДС, водомер (счетчик холодной воды) (инв. №61692576) – 60,25 бел. руб. с увеличением на сумму НДС, кухонная плитка CEZARIS ПГ 2100-01 (инв. № 61692982) – 119,12 бел. руб.
При приобретении Лота № 3 победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи следующего имущества: счетчики учета воды (инв. № 60004411) – 20,63 бел. руб. с увеличением на сумму НДС, счетчики учета воды (инв. № 60004412) – 20,63 бел. руб. с увеличением на сумму НДС

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении повторного аукциона опубликовано в газете «Звязда» 09.08.2018 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **10.10.2018** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **08.10.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

---

# РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «ВМЕСТЕ К МОРЮ – 2»

1. Сведения об организаторе:

1.1. Наименование – Общество с ограниченной ответственностью «Еврофасадсервис» (ООО «Еврофасадсервис»), УНП 190797364, зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета № 146 от 26 января 2007 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190797364.

1.2. Местонахождение организации:

1.2.1. юридический адрес: г. Минск, ул. Машиностроителей, 13, кабинет 3;

1.2.2. почтовый адрес: 220118, г. Минск, ул. Машиностроителей, 13.

2. Наименование рекламной игры – «Вместе к морю – 2». Свидетельство № 3228 о государственной регистрации рекламной игры «Вместе к морю – 2», зарегистрированной 16 марта 2018 г.

3. Территория проведения игры – Республика Беларусь.

4. Сроки проведения рекламной игры:

4.1. Срок начала рекламной игры: 2 апреля 2018 г.;

4.2. Срок окончания рекламной игры: 9 октября 2018 г.

5. Розыгрыш приза проводился 4 сентября 2018 года в 14.00.

6. Количество участников рекламной игры – 709 человек.

7. Сведенья о победителе и выигрыше:

Призовой фонд в размере 1 377,06 (одна тысяча триста семьдесят семь рублей 06 копеек) был разыгран полностью.

8. Информация о победителе представлена в таблице.

| | Ф.И.О. | Приз |
|---|---|---|
| 1 | Белякович Светлана Евгеньевна (номер купона 06-3237) | **Сертификат на поездку в Турцию на двоих человек стоимостью 1 213 руб. 90 коп. и денежная часть приза в размере 163 руб. 16 коп. для уплаты подоходного налога.** Описание призового фонда: Даты заезда и выезда: 11 октября 2018 г. – 18 октября 2018 г.; отель Sunstar Resort Hotel 5*; продолжительность – 7 ночей; категория номера Standard; питание – все включено (шведский стол); авиаперелет Киев – Турция (Алания) – Киев; трансфер групповой аэропорт – отель – Аэропорт. Медицинская страховка. Победитель самостоятельно осуществляет трансфер до Киева и обратно |

**Телефоны для справок:**
(городской) 388-10-60, (мобильный) 8 044 789 19 40, время работы с 9.00 до 18.00, за исключением выходных и праздничных дней.

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН**. Пажадана рэалістычна ацаніць свае сілы і магчымасці, павелічэнне аб'ёму працы можа негатыўна адбіцца на вашым здароўі. У сераду ёсць рызыка адчуць сябе не ў сваёй талерцы нават у кампаніі блізкіх сяброў. Але да пятніцы гэта пройдзе, дзень прынясе прыемную вестку. У выхадныя нечакана абвастраць адносіны са сваякамі, паспрабуйце быць дыпламатычнымі.

**ЦЯЛЕЦ**. Важна верыць у сябе, але не стаць напышлівым і ганарыстым чалавекам. Пралічваць кожны свой крок загадзя. Удзяліце належную ўвагу блізкім людзям і іх інтарэсам. Аўторак можа аказацца важным днём для пачатку ўвасаблення ў жыццё новых праектаў. На сераду не варта планаваць важныя перагаворы, паспрабуйце кантраляваць негатыўныя эмоцыі. Пятніца абяцае парадаваць энергетычным уздымам, добрым настроем і ўвагай з боку навакольных.

**БЛІЗНЯТЫ**. Для поспеху на гэтым тыдні вельмі важныя новыя творчыя ідэі. Далей паласа шанцавання пашырыцца, і вы атрымаеце новы цікавы вопыт і прыбытак. Душэўную раўнавагу можа парушыць адчуванне, што вы ўпусцілі нейкі бліскучы шанц. Нічога падобнага, наадварот, варта падзякаваць лёсу за тое, што вы шчасліва пазбеглі праблем, з гэтым шанцам звязаных.

**РАК**. Аднастайнасць і спакой на гэтым тыдні можа злёгку надакучыць. Але не варта ўпадаць у роспач, падумайце пра павышэнне ўзроўню адукацыі. У канцы тыдня паспрабуйце як мага больш паважліва разамаўляць з начальствам, не варта дазваляць сабе ні найменшага намёку на свабоду адносін, нават калі ў вас усё вельмі дэмакратычна. Не выключана, што блізкія маюць патрэбу ў вашай дапамозе, прапануйце яе.

**ЛЕЎ**. У панядзелак будзе нямала мітусні. У аўторак знойдзецца прымяненне вашаму інтэлектуальнаму патэнцыялу, ён дапаможа дамагчыся поспеху і прызнання навакольных. У чацвер пажадана не спрачацца з начальствам і не ствараць канфліктнай сітуацыі ў калектыве. Паспрабуйце рэальна ацэньваць свае магчымасці і не засмучацца па дробязях. У выпадку няўдачы проста выпраўце допушчаныя памылкі, і дасягняце мэты. Давайце паменш абяцанняў: выканаць іх будзе цяжка.

**ДЗЕВА**. На гэтым тыдні вас могуць парадаваць дзеці або каханы чалавек. На працы магчымая дадатковая нагрузка, якая наўрад ці прынясе прыбытак. У выніку атрымаеце пшык, а выматаецеся моцна. Трымайце ў тайне вашы намеры, паменш кажыце пра тое, што збіраецеся рабіць. З панядзелка па сераду можа паступіць цікавая інфармацыя, звязаная з новай працай. У пятніцу добра было б канцэнтраваць не толькі свае дзеянні, але і думкі, каб не ўпасці ў роспач.

**ШАЛІ**. Вы павінны быць адкрытыя для дзелавых прапаноў, і яны пачнуць паступаць у нарастальным тэмпе. У рашэнні асабістых пытанняў больш спадзявайцеся на інтуіцыю, логіка наўрад ці прывядзе да жаданых вынікаў. У аўторак будуць удалымі дзелавыя паездкі і перагаворы. У чацвер не варта ісці на поваздзе ў эмоцый, губляць галаву ад гневу або любові. Магчымыя перапады настрою. Выхадныя правядзіце ў коле сям'і.

**СКАРПІЁН**. Тыдзень абяцае быць напоўнены разнастайнымі прыемнымі падзеямі. Ужо ў панядзелак можна разлічваць на поспехі ў справах, разуменне і прызнанне з боку кіраўніцтва. У пятніцу зможаце расслабіцца і з пачуццём выкананага абавязку пайсці на выхадныя. У суботу вам абяцаная гармонія са светам, з сабой і з каханым чалавекам.

**СТРАЛЕЦ**. Змена планаў, тэрміновыя справы — нібы ў калейдаскопе прамільгне гэты ўзрушальны тыдзень. У панядзелак і ў аўторак збярыцеся з сіламі і не адкладайце складаныя пытанні на потым. Калі штосьці не будзе атрымлівацца, паспрабуйце не ісці напралом, прыдумайце абыходны манеўр. Чым менш будзеце расказваць пра свае намеры і планы, тым хутчэй яны ажыццявяцца. Не дазваляйце апатыі і ляноце падабрацца да вас занадта блізка.

**КАЗЯРОГ**. Вы будзеце бліскаць досціпам, у вас ёсць усе шанцы зрабіць уражанне і набыць новых сяброў. У сярэдзіне тыдня давядзецца папрацаваць больш за звычайнае, аднак, якім бы дзіўным гэта ні здавалася, вы ўспрымеце гэта з лёгкасцю, калі не з задавальненнем. Не спрабуйце змяніць сваіх блізкіх, прымайце іх такімі як ёсць. Найбольш спрыяльныя дні на гэтым тыдні — чацвер і пятніца, неспрыяльны — аўторак.

**ВАДАЛІЎ**. Давядзецца паказаць навакольным, на што вы здольныя. Трэба будзе адстойваць сваё меркаванне і, магчыма, змагацца за інтарэсы сяброў, родных або дзелавых партнёраў. У панядзелак не варта ні спяшацца, ні спрабаваць займацца некалькімі справамі адначасова. Энергія вам спатрэбіцца пазней, пакуль трэба вычакаць. Зручны момант для ажыццяўлення задуманага наступіць у другой палове тыдня.

**РЫБЫ**. Тыдзень можа аказацца стракатым і напружаным, але гэта не павінна палохаць. Больш за тое, спроба ігнараваць уласныя праблемы можа ўзвесці іх у квадрат. У аўторак не саромейцеся праявіць свае арганізатарскія і лідарскія якасці. У чацвер і пятніцу самай важнай праблемай могуць стаць узаемаадносіны ў сям'і. Паспрабуйце не даваць волі эмоцыям. Дзецям можа спатрэбіцца ўвага і падтрымка.

## Даты | Падзеі | Людзі

**7 ВЕРАСНЯ**

У краіне

**1805** год — нарадзіўся (мястэчка Смілавічы) Ян Бараноўскі, фінансіст, вынаходнік. Скончыў Мінскую класічную гімназію, затым Віленскі універсітэт са ступенню кандыдата права. Служыў у Польскім банку, пазней — у банках Францыі, з 1843 года інспектар бухгалтэрыі чыгункі Парыж — Руан — Гаўр. На сусветных выстаўках узнагароджаны: медалём за такс-машыну для кантролю праязных білетаў (Парыж, 1849 год), у Лондане ў 1851 годзе — вялікім медалём за машыну для друкавання і кантролю чыгуначных білетаў. Распрацаваў сістэму аўтаматычнай сігналізацыі на чыгунцы. Памёр у 1888 годзе.

**1938** год — нарадзіўся (г. Слуцк) Генадзь Сцяпанавіч Горын, беларускі вучоны ў галіне трактарабудавання, доктар тэхнічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па абгрунтаванні цягава-энергетычных паказчыкаў паваротвальнасці і ўстойлівасці руху машынна-трактарных агрэгатаў.

У свеце

**1870** год — нарадзіўся Аляксандр Купрын (1870—1938), рускі пісьменнік. У 1903 годзе зблізіўся з М. Горкім, супрацоўнічаў у яго выдавецтве «Знание». У 1919 годзе эмігрыраваў у Францыю, але ў 1937-м вярнуўся на радзіму. Пасля паездкі на Палессе ў 1897 годзе напісаў цыкл апавяданняў «У лясной глушы», «На глушцоў», аповесць «Алеся». Аўтар аповесцяў «Яма», «Вадкае сонца», цыкла нарысаў «Кіеўскія тыпы», рамана «Юнкеры». Многія творы пісьменніка экранізаваны. Сярод іх: «Алеся», «Паядынак» і іншыя.

**1908** год — нарадзіўся Майкл Дэбейкі (1908—2008), амерыканскі кардыяхірург, распрацоўшчык шматлікіх важных метадаў лячэння захворванняў сэрца, у тым ліку аортакаранарнага шунціравання (1964). У 1953 годзе першым у свеце зрабіў паспяховую аперацыю на соннай артэрыі, адкрыўшы магчымасць хірургічнага лячэння інсульта.

**1923** год — на міжнародным кангрэсе ў Вене была створана Міжнародная камісія крымінальнай паліцыі, з 1956 года — Інтэрпол.



**1945** год — з нагоды перамогі ў Другой сусветнай вайне ў Берліне адбыўся парад саюзных войскаў СССР, Вялікабрытаніі, Францыі і ЗША. Ідэя правядзення гэтага парада належала маршалу Жукаву.

**1953** год — пленум ЦК КПСС выбраў першым сакратаром ЦК КПСС былога сакратара МГК і МК КПСС М. С. Хрушчова (кіраваў партыяй і краінай да кастрычніка 1964 года).

## Запрашальнік

### УСЁЙ СЯМ'ЁЙ — НА ДЗЕНЬ ТАНКІСТА

**У найбліжэйшую нядзелю, 9 верасня, у мінскім парку Перамогі адбудзецца грандыёзнае свята — гарадскі сямейны фестываль «Дзень танкіста — 2018».**




Падзея мае быць яшчэ больш цікавая і насычаная, чым летась. Арганізатар — кампанія Wargaming — пры падтрымцы Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта абяцае цэлы мех розных забаў і цікавінак. Гасцей свята, ад самых маленькіх да самых сталых, чакаюць: сапраўдныя танкі — гістарычныя Т-34-85 і ІС-2, сучасны Т-72Б3, вялізная гульнявая зона для аматараў World of Tanks, зона па навучанні і стральбе на спецыяльным трэнажоры, 55 лакацый з актыўнымі гульнямі і спаборніцтвамі, 15 фотазон і арт-аб'ектаў, сустрэчы са знакамітымі беларускімі спартсменамі, больш за 100 фуд-кортаў і г. д. На фестываль арганізатары запрасілі знакамітыя музычныя калектывы — «Танцы мінус», IOWA, «Бумбокс», а таксама Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь. Трансляцыя свята будзе весціся ў інтэрнэце на старонцы World of Tanks Vkontakte — vk.com/worldoftanks. Уваход вольны, пачатак а 14-й гадзіне.

**Іван КУПАРВАС**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.28 | 19.46 | 13.18 |
| Віцебск — | 6.16 | 19.38 | 13.22 |
| Магілёў — | 6.18 | 19.36 | 13.18 |
| Гомель — | 6.17 | 19.31 | 13.14 |
| Гродна — | 6.43 | 20.01 | 13.18 |
| Брэст — | 6.46 | 19.59 | 13.13 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 3 верасня.*

*Месяц у сузор'і Льва.*

**Імяніны**

*Пр. Варфаламея, Міны, Уладзіміра.*

*К. Рэгіны, Маркa, Рычарда, Сцяпана.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## ЗАЎТРА




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3255.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 верасня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

7 верасня 2018 г. № 36 (469)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# «ЗЯЛЁНЫЯ» НАСТУПАЮЦЬ

**Інвазійныя расліны наносяць шкоду прыродзе, здароўю людзей і эканоміцы краіны. Якім чынам можна гэтаму супрацьстаяць?**

**Папаўненне беларускай флоры новымі раслінамі, мэтанакіравана ці выпадкова прывезенымі з іншых краін, на жаль, не заўсёды праходзіць бяскрыўдна. Некаторыя з «чужаземцаў» выходзяць з-пад кантролю і пачынаюць захопліваць усё большыя тэрыторыі. Спецыялісты называюць такія расліны інвазійнымі.**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4-16-й стар.

ІНІЦЫЯТЫВА

# Альтанкі для сталых, горкі для юных

## Гамяльчанам прапануюць добраўпарадкоўваць двары на долевых умовах

**САМЫМІ прывабнымі дварамі становяцца тыя, дзе парадак наводзілі самі жыхары. Гэтую думку да тых, хто жыве на вуліцы Мінскай, паспрабавалі данесці кіраўніцтва і спецыялісты КЖРЭУП «Савецкае». Для чаго і правялі сустрэчу з людзьмі.**

**Дырэктар камунальнага прадпрыемства, дэпутат гарадскога Савета Міхаіл ПРУС** прапанаваў жыхарам фінансава паўдзельнічаць у добраўпарадкаванні тэрыторыі. За сабраныя сродкі можна ўсталяваць гульневае абсталяванне, лаўкі, іншыя малыя формы.

Мяркуецца, што са свайго боку КЖРЭУП сплануе тэрыторыю, выдзеліць тэхніку і працоўныя рукі. На жаль, на большае разлічваць не даводзіцца, бо грошы на гэтыя мэты цяпер не выдаткоўваюцца. Некалькі гадоў таму з тэхнічнага абслугоўвання жыллёвага фонду выключылі работы па добраўпарадкаванні тэрыторый каля дамоў. Прапанавалі шукаць спонсараў, каб за іх кошт абсталёўваць прыгожыя дзіцячыя пляцоўкі.

І такія выпадкі здараюцца. Напрыклад, зусім нядаўна ў Рэчыцы грамадзянін падараваў двару дзіцячы спарткомплекс, які каштуе прыкладна паўтары тысячы рублёў. Пры гэтым вырашыў застацца невядомым для грамадскасці.

Індывідуальны прадпрымальнік з уласнай ініцыятывы ўстанавіў у мікрараёне Наварэчыцкі вулічны спартыўны комплекс беларускай вытворчасці з усімі неабходнымі для падобных збудаванняў



**Дырэктар камунальнага прадпрыемства «Савецкае», дэпутат гарадскога Савета Міхаіл ПРУС на сустрэчы з жыхарамі.**

сертыфікатамі. Ён кампактны, выкананы з металу, абсталяваны турнікамі, лесвіцамі, рукаходам і іншымі элементамі. Пры гэтым супрацоўнікі мясцовага ЖЭУ ўзгаднялі месца ўстаноўкі і дапамагалі з мантажом.

Аднак падобныя ініцыятывы пакуль рэдкасць, і таму камунальнікі Савецкага раёна ідуць па іншым шляху.

стар. 16

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Рабочая група ў дзеянні



Бурныя дыскусіі і спрэчкі вакол праекта змяненняў у закон. стар. 2

### Да форуму рэгіёнаў




У Магілёве гарачая пара: працягваецца падрыхтоўка аб'ектаў. стар. 3

### Нельга чакаць



Нават невялікае прамаруджванне дасць «агрэсару» шанц. стар. 13

### На свае вочы



Палацава-паркаваму комплексу пагражае... нашэсце сумніку. стар. 15

### Адпачнулі на бульбафэсце



Дбайных людзей славілі ды весела час бавілі. стар. 16

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9



# НОВОМУ ПОКОЛЕНИЮ — ПРИВЕТ!

**В День знаний к детям на линейки отправились чиновники, депутаты и парламентарии всех уровней, чтобы поделиться собственным опытом и дать наставления. Куда же в этот важнейший для школьников, их родителей и учителей день поехали члены Совета Республики Национального собрания Беларуси?**

**Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александр ПОПКОВ** направился в Лиозно, где принял участие в торжественных мероприятиях в местной средней школе № 1. Парламентарий поздравил учителей, учащихся и их родителей с началом учебного года и пожелал школьникам отличной учебы и успехов, а учителям — плодотворной и конструктивной работы.

Кроме того, Александр Попков побеседовал с педагогами государственного учреждения образования об актуальных вопросах учебного процесса.

На этом работа не завершилась: в тот же день парламентарий совместно с председателем правления Белкоопсоюза Валерием Ивановым посетил ряд объектов потребкооперации. Во время посещения Лиозненского хлебозавода делегация встретилась с руководством и сотрудниками предприятия, чтобы совместно обсудить проблемные аспекты и перспективы.

**Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по экономике, бюджету и финансам Владимир ПАНТЮХОВ** посетил Чаусскую областную среднюю школу, где обратился к учащимся и педагогическому коллективу с пожеланием, чтобы новый учебный год стал ярким, успешным, полным новых побед и открытий.



**Владимир ПАНТЮХОВ (крайний слева) во время посещения Чаусской областной средней школы.**

По мнению парламентария, ребятам для достижения по-настоящему высоких результатов необходимо ставить большие цели и приложить все усилия для того, чтобы их добиться. В качестве примера упорного труда, который был щедро вознагражден, Владимир Пантюхов назвал олимпийскую чемпионку Динару Алимбекову, которая заканчивала именно эту школу. Кстати, спортсменка также присутствовала на торжественной линейке.

Поздравления и подарки Чаусская областная средняя школа получила в том числе и от представителей ОАО «Могилевхимволокно», Могилевской таможни, Чаусского райисполкома и других организаций.

**Заместитель председателя Постоянной комиссии Совета Республики по образованию, науке, культуре и социальному развитию Виктор СИРЕНКО** в День знаний посетил Деревнянскую среднюю школу Столбцовского района Минской области.

**Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по законодательству и государственному строительству Алла БОДАК** отправилась в Несвиж, где приняла участие в торжественных мероприятиях в средней школе № 1.

***

В начале же рабочей недели **Алла БОДАК** провела выездной личный прием граждан и юридических лиц на СП ООО «Фармлэнд» в Несвиже. Во время встреч с людьми поднимались вопросы правил пребывания иностранных граждан на территории Республики Беларусь и правового статуса молодых специалистов. Кроме того, говорили о применении законодательства в сфере жилищных правоотношений. На каждый из проблемных моментов парламентарий дала исчерпывающий ответ.

Ранее личный прием граждан и прямую телефонную линию в Горбовичском сельском Совете депутатов Могилевской области провел **Владимир ПАНТЮХОВ**. Граждан интересовали следующие темы: порядок на земле, благоустройство и санитарное содержание населенных пунктов, кредитование молодых специалистов. Отдельный момент — это вопросы жилья: постановка на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий, предоставление жилых помещений государственного жилищного фонда. Всем были даны разъяснения, а некоторые вопросы взяты на контроль.

**Владислав ЛУКАШЕВИЧ.**

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# ДОНАР? АЛЬБО ТАТА?

## Праект змяненняў у Закон «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях» выклікаў дыскусію ў верхняй палаце парламента

**Законапраект, нагадаем, быў унесены ў Палату прадстаўнікоў напрыканцы чэрвеня і цяпер рыхтуецца да першага чытання. Асноўныя навацыі: павелічэнне ўзроставага парога пэўных катэгорый донараў палавых клетак; увядзенне кантролю за донарскімі палавымі клеткамі з банкаў замежных дзяржаў; павелічэнне ўзроставага парога для сурагатнай маці ў выпадках, калі яна з'яўляецца сваячкай пацыенткі, і магчымасць вынасіць у такім выпадку дзіця незамужняй жанчыне (пры наяўнасці паўналетніх дзяцей і адсутнасці непаўналетніх); адказнасць за парушэнне заканадаўства ў сферы дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій...**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Названыя змены не выклікалі прынцыповых спрэчак сярод членаў рабочай групы, якая працавала над законапраектам. Але гэтага нельга сказаць пра ўдакладненне да артыкула 19 дзеючага Закона — яно датычыцца донарства палавых клетак для жанчыны, якая не знаходзіцца ў афіцыйна зарэгістраваным шлюбе. Менавіта гэты пункт выклікаў гарачыя і шматгадзінныя, па словах удзельнікаў рабочай групы, дыскусіі да ўнясення дакумента ў парламент. Каменем спатыкнення «шлюбнае пытанне» стала і падчас круглага стала, які правяла Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.

Законапраект дазваляе жанчыне, якая не знаходзіцца ў зарэгістраваным шлюбе, скарыстацца палавымі клеткамі толькі ананімнага донара. Гэта азначае забарону на выкарыстанне клетак мужчыны, з якім яна жыве. Большасць членаў працоўнай групы, у якую ўвайшлі як юрысты і чыноўнікі, так і практыкуючыя ўрачы, не бачаць у гэтым ніякай праблемы.

І Ала Камлюк, загадчыца аддзялення планавання сям'і і дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця», і Святлана Жукоўская, дырэктар Цэнтра рэпрадуктыўнай медыцыны «ЭКА», сцвярджаюць, што дастаткова пагаварыць з парай, якая звяртаецца да рэпрадуктолагаў, і яна рэгіструе шлюб. Маўляў, тых, хто прынцыпова не афармляе адносіны, адзінкі. Такія вымушаны ехаць па атрыманне медыцынскай паслугі за мяжу. (У Расіі і на Украіне наяўнасць зарэгістраванага шлюбу для зачацця дзіцяці ў лабараторных умовах не абавязковая.)

Разам з тым ніхто дакладна не ведае, колькі людзей у нас жыве фактычна сям'ёй, якую, тым не менш, не афармляюць юрыдычна, колькі з іх маюць дзяцей, колькі лечыцца ад бясплоднасці і гатовы выкарыстаць рэпрадуктыўныя тэхналогіі. У нас няма такой статыстыкі. А калі няма ўліку, то ёсць вялікая спакуса з гэтай катэгорыяй грамадзян не лічыцца. Менавіта гэта выклікала абурэнне намесніка старшыні профільнай камісіі Савета Рэспублікі Віктара Сірэнкі, які выступіў мадэратарам абмеркавання законапраекта ў верхняй палаце. Пазіцыя сенатара заслугоўвае павагі: заплюшчваючы вочы на рэаліі жыцця, мы рызыкуем выпусціць закон, які не будзе працаваць, правілы ў ім будуць самі па сабе, жыццё людзей — само па сабе. У нас ёсць такія законы. Дык ці варта памнажаць іх колькасць?

Само паняцце «бясплоднасць» адрозніваецца ў Беларусі і ў свеце. Сусветная арганізацыя аховы здароўя гэтым тэрмінам называе «нездольнасць сексуальна актыўнай пары, якая не выкарыстоўвае кантрацэпцыю, дабіцца цяжарнасці на працягу года». Ала Камлюк прывяла наступнае вызначэнне бясплоднасці, паводле, як яна патлумачыла, беларускіх дакументаў: «Гэта адсутнасць жаданай цяжарнасці ў шлюбнай пары на працягу года рэгулярнага палавога жыцця». З-за розніцы ў тэрміналогіі ў нас і лічаць толькі шлюбныя пары, пакідаючы па-за статыстыкай мужчын і жанчын, якія не афармілі адносіны ў ЗАГСе.

— Вы не жадаеце бачыць такіх людзей і іх праблему, называеце гэта сацыяльнай безадказнасцю, але ад гэтага праблема не знікае, і яе ігнараванне стварае глебу для карупцыі або садзейнічае вывазу грошай за межы краіны, — звярнуўся да ўдзельнікаў круглага стала Віктар Сірэнка. — Але дзяржава аднолькава клапоціцца пра ўсіх сваіх грамадзян, у тым ліку і пра тых, хто не можа зацяжарыць натуральным чынам.

Аргументы працоўнікаў выкарыстання ЭКА парай, якая не афарміла адносіны, заснаваны, галоўным чынам, на немагчымасці на сёння рэгуляваць у такім выпадку донарства мужчынскіх палавых клетак. Немагчыма праверыць, ці сапраўды па дапамогу звярнулася сталая пара, а не жанчына з малазнаёмым мужчынам, які сёння выступае донарам для яе ў адным цэнтры, а заўтра пойдзе з іншай жанчынай у іншы цэнтр. У такім выпадку ўзнікае верагоднасць адразу некалькіх непажаданых наступстваў. Дзеці ад аднаго бацькі і розных жанчын у будучыні могуць сустрэцца і пабрацца шлюбам, не ведаючы, што яны адзінакроўныя брат і сястра, што паступова прывядзе да назапашвання генных мутацый. Яшчэ адзін аргумент — абарона правоў дзіцяці. Маўляў, такі донар можа або адмовіцца ад утрымання дзіцяці або, наадварот, выступіць з прэтэнзіяй на бацькоўства з усімі наступствамі, якія з гэтага выцякаюць. Нарэшце, палавыя клеткі неананімных донараў не праходзяць своеасаблівы каранцін і такое ж дасканалае даследаванне, як ананімных, а гэта павышае рызыку перадачы інфекцыйных хвароб.

Аднак узнікае пытанне: чаму нельга дасканала даследаваць здароўе ўсіх мужчын, якія прыйшлі па дзіця разам з жанчынамі? Чаму нельга ўлічыць усіх донараў мужчынскіх палавых клетак і стварыць адзіны банк даных, каб пазбегнуць злоўжывання? Чаму, нарэшце, дакладна не агаварыць бацькоўскія правы адносна будучага дзіцяці? Таму што працасі не заўважаюць?

Калісьці дзеці, народжаныя па-за шлюбам, былі па-за законам. Цяпер гэта перажытак мінулага. Дык чым адрозніваюцца ад іх дзеці, у зачацці якіх бяруць удзел урачы? Ці не ханжаства, апелюючы да сям'і як да вышэйшай каштоўнасці ў дзяржаве, адмаўляць людзям, якія, па сутнасці, сям'я, у дапамозе мець дзяцей — толькі на той падставе, што юрыдычна яны сям'ю не афармілі? Пры гэтым, заўважым, закон не забараняе жанчыне зацяжарыць з дапамогай рэпрадуктыўных тэхналогій ад незнаёмага мужчыны (ананімнага донара) без усякіх абавязацельстваў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**❍ Даведка:**

✓ Згодна з апошнім перапісам, у Беларусі 25 % сем'яў (зарэгістраваных у ЗАГСе) не маюць дзяцей па розных прычынах.

✓ Па недакладных падліках, 14 % шлюбных пар у краіне сутыкнуліся з праблемай бясплоднасці.

✓ Першая платная паслуга па экстракарпаральным апладненні (ЭКА) у Беларусі была аказана ў 1993 годзе ў Гомельскім абласным дыягнастычным медыка-генетычным цэнтры «Шлюб і сям'я».

✓ У нашай краіне восем цэнтраў аказваюць медыцынскія паслугі з выкарыстаннем дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій: тры дзяржаўныя і пяць недзяржаўных.

✓ Штогод у краіне нараджаецца каля 1000 немаўлят, якія былі зачатыя з дапамогай рэпрадуктыўных тэхналогій.

✓ Для правядзення ЭКА пацыенты могуць узяць ільготны крэдыт.

**Пляцоўкай сімпозіума «Аграрная палітыка Саюзнай дзяржавы: вопыт, праблемы і перспектывы» стала найстарэйшая ВНУ Беларусі — Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія. Мерапрыемства доўжыцца два дні — з 6 па 7 верасня. Нагодай для сустрэчы навукоўцаў стаў V Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбудзецца ў кастрычніку ў Магілёве.**




ФОРУМ РЭГІЁНАЎ

# ІНАВАЦЫІ Ў КААПЕРАЦЫІ

## Міжнародная канферэнцыя, прысвечаная тэме развіцця аграрнай палітыкі Саюзнай дзяржавы, праходзіць у Горках

— У рамках пленарнага пасяджэння канферэнцыі ўдзельнікі абмяркуюць фарміраванне інавацыйных сістэм жывёлагадоўлі Беларусі і Расіі, у прыватнасці магчымасці стварэння адзіных спецыялізаваных селекцыйна-генетычных цэнтраў. Размова таксама пойдзе аб распрацоўцы сістэм машын сельскагаспадарчага прызначэння і кааперацыі двух краін у гэтай сферы. У цэнтры ўвагі спецыялістаў будуць у тым ліку пытанні развіцця сістэм прафесійнай і вышэйшай аграрнай адукацыі ў Саюзнай дзяржаве, — паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.

У першы дзень навуковага форуму запланавана праца трох тэматычных секцый, а таксама выстаўка прадукцыі аграпрамысловых комплексаў Беларусі. У пятніцу пройдзе пленарнае пасяджэнне канферэнцыі з удзелам парламентарыяў, навукоўцаў, прадстаўнікоў Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь і Міністэрства сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі. Мадэратарамі дыскусіі выступаюць старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр Папкоў і намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі па аграрнахарчовай палітыцы і прыродакарыстанні Сяргей Белавусаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ГЭТА БУДЗЕ САПРАЎДНАЕ СВЯТА

## У Магілёве працягваецца падрыхтоўка аб'ектаў да V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі

**Магілёў за апошні час прыкметна папрыгажэў. Работы вядуцца з улікам таго, што гораду прыйдзецца прымаць у сябе гасцей высокага ўзроўню. Працэс кантралююць гарадскія, абласныя і рэспубліканскія ўлады. Нядаўна на знакавых аб'ектах форуму пабываў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

### Да прыёму гасцей гатовы

З удзелам спікера беларускага парламента адбылося ўрачыстае адкрыццё музея Бялыніцкага-Бірулі — філіяла Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Установа знаходзілася на рамонце доўгіх пяць гадоў, на яе аднаўленне з розных крыніц патрачана больш за тры мільёны рублёў. За час рамонту памянялася ўнутраная прастора музея — яе сучаснае аснашчэнне дасць магчымасць прымаць выстаўкі сусветнага ўзроўню. Новае выставачнае і мультымедыйнае абсталяванне, забеспячэнне ў памяшканнях неабходнага музейнага клімат-кантролю, нават пылапаглынальная сістэма — пра гэта раней маглі толькі марыць.

— Падчас работы форуму ў сценах музея адкрыецца выстаўка «Скарбы жывапісу» з фондаў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі і Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Гэта творы блізкіх сяброў Бялыніцкага-Бірулі: Ісака Левітана, Мікалая Багданава-Бельскага, Аляксандра Маравава, Станіслава Жукоўскага, Ігара Грабара, Аляксея Сцяпанава і іншых, — удакладніла **загадчык музея В. К. Бялыніцкага–Бірулі Святлана СТРОГІНА.**

А трэці паверх установы стане шыкоўнай пляцоўкай для музейных заняткаў, лекцый, сімпозіумаў. Апаратура, якая тут устаноўлена, дазваляе праводзіць анлайн-канферэнцыі па самых высокіх стандартах.

### Навука сусветнага ўзроўню

Вельмі змястоўнай была сустрэча Міхаіла Мясніковіча з выкладчыкамі і студэнтамі Беларуска-Расійскага ўніверсітэта.

— Наш універсітэт з'яўляецца ўнікальнай навучальнай установай Беларусі, бо рыхтуе студэнтаў адначасова па адукацыйных стандартах Беларусі і Расіі з выдачай дыпломаў дзяржаўнага ўзору абедзвюх краін, — адзначае **першы прарэктар універсітэта прафесар Міхаіл ЛУСЦЯНКОЎ.** — Гэта рэальны прыклад інтэграцыі адукацыйных сістэм дзвюх краін.

У сценах ВНУ рэалізуецца мадэль «універсітэт 3.0» — створана навукова-адукацыйнае асяроддзе, якое дазваляе рыхтаваць рынкава-арыентаваных спецыялістаў. Яны не проста валодаюць ведамі ў той ці іншай галіне тэхнікі, а здольныя падрыхтаваць высокатэхналагічны прадукт і знайсці для яго спажыўца на рынку ў адпаведнасці з ланцужком «адукацыя — навука — інавацыі — вытворчасць — камерцыялізацыя». Каб гэтую мадэль рэалізаваць, створана высокатанажная вытворчасць тэхналагічнай прадукцыі, а менавіта вытворчасць валаконных эндаскопаў тэхнічнага прызначэння. Акрамя гэтага, нядаўна пры ўніверсітэце адкрыўся інжынірынгавы цэнтр SimTech, які займаецца аптымізацыяй разнастайных канструкцый, працуе наўпрост з такімі гігантамі, як БелАЗ, і ўдзельнічае ў дзяржпраграмах навуковых даследаванняў, заключае дагаворы на выкананне работ з рознымі прадпрыемствамі машынабудавання.

Ва ўніверсітэце вельмі развіты студэнцкі навуковы складнік, ёсць студэнцкія канструктарскія бюро.

— Мы ўводзім сёлета дысцыпліны ў адукацыйныя планы па падрыхтоўцы спецыялістаў, каб павысіць іх кампетэнцыю ў галіне рынкавай эканомікі, — заўважае Міхаіл Лусцянкоў.

Плануецца, што да пачатку форуму будзе ўрачыста адкрыты дадатковы корпус Беларуска-Расійскага ўніверсітэта — ён ужо на 80 % гатовы.

Міхаіла Мясніковіча цікавіла, што новага распрацавана ва ўніверсітэце ў галіне навукі і тэхналогій. На выстаўцы ён азнаёміўся з навуковымі дасягненнямі ўніверсітэта.

— Усе распрацоўкі ўнікальныя, — паведаміў **дацэнт кафедры фізічных метадаў кантролю Фёдар ТРУХАЧОЎ.** — Вось гэта сістэма, напрыклад, ужо ўкаранёна ў Мінску. Раней у гарадскім транспарце пра чарговыя прыпынкі паведамляў бягучы радок, а зараз мы паставілі два цалкам аўтаматызаваныя мультымедыйныя экраны. Яны паказваюць, дзе вы едзеце, паведамляюць на дзвюх мовах пра перасадкі, славутасці, якія знаходзяцца на дадзеным адрэзку шляху, надвор'е і гэтак далей. Першы, доследны, узор быў пастаўлены два гады таму.

Спецыяліст дэманструе прыбор, якога пакуль няма ні ў адной краіне свету.

— Гэта электронны гід, які знаходзіцца ў кабіне ў кіроўцы і працуе ў аўтаномным рэжыме, — тлумачыць ён. — Сістэма цалкам з нуля распрацаваная ў нас, разлічана ў першую чаргу на турыстаў.



Фота БелТА.

### Форум — гэта адказна

Старшыня Савета Рэспублікі азнаёміўся таксама з ходам рамонтных работ у Палацы культуры вобласці, дзе адбудзецца пленарнае пасяджэнне Форуму рэгіёнаў.

— Гэта вельмі адказнае мерапрыемства, у Беларусі яно ўпершыню праходзіць на рэгіянальнай пляцоўцы, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — У ім будуць задзейнічаны ўсе рэгіёны Беларусі і Мінск. Плануюцца рознага роду мерапрыемствы, шоу сучаснай беларускай тэхнікі, шмат чаго іншага. Гэта будзе сапраўднае свята рэгіёнаў, сюды завітаюць прадстаўнікі гарадоў-пабрацімаў, бізнесу. На падставе тых матэрыялаў, якімі я ўжо валодаю, нашы прадпрыемствы, бізнесмены заключаць экспартныя кантракты з расійскімі партнёрамі на суму каля 500 мільёнаў долараў. Гэта значна больш, чым было ў папярэднія гады. Вельмі актыўна паводзяць сябе нашы Саветы дэпутатаў, ёсць жаданне і імкненне расійскіх калег з глыбінкі прыехаць і паглядзець на мерапрыемствы, якія праводзяцца ў рамках Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Плануецца традыцыйны ўдзел у мерапрыемстве кіраўнікоў дзвюх дзяржаў — Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна. Гэта вельмі адказна і карысна як для структур улады, так і для насельніцтва.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

АКТУАЛЬНА

# Купіць домік у вёсцы

## Кіраўнік дзяржавы падпісаў указ № 357, накіраваны на змяншэнне колькасці безгаспадарных і аварыйных будынкаў

**У беларускіх вёсках больш за 30 тысяч дамоў прызнаны старымі і звыш 10 тысяч — пустуючымі. Новы ўказ «Аб пустуючых і старых дамах» прадугледжвае магчымасць іх прамога продажу. Адпаведныя прапановы па асобных аб'ектах будуць публікавацца на сайтах мясцовых выканкамаў.**

### Толькі адзін ахвотны

Калі на працягу 30 дзён заяву на куплю падасць толькі адзін чалавек, з ім і будзе заключаны дагавор куплі-продажу. Правядзенне аўкцыёну прадугледжана пры паступленні некалькіх заяў. Пры гэтым магчымасць прамога продажу ёсць на ўсёй тэрыторыі краіны, за выключэннем абласных цэнтраў і Мінска.

Цяпер у грамадзян з'яўляецца магчымасць атрымаць зямельны ўчастак без выкупу пустога дома. Але гэта пры ўмове самастойнага зносу такога дома альбо фінансавання падобных работ. (Участак можна атрымаць без правядзення аўкцыёну на ўсёй тэрыторыі краіны, за выключэннем абласных цэнтраў.)

### Прызнаецца пустуючым

Для выяўлення такіх дамоў спецыяльныя камісіі будуць двойчы ў год аглядаць нерухомасць на адпаведных тэрыторыях. Раней былі больш жорсткія ўмовы: дом прызнавалі пустуючым, калі гаспадар пражываў у ім менш за месяц штогод на працягу трох гадоў.

Цяпер не будуць прызнавацца пустуючымі дамы, у якіх уласнікі пражывалі хоць бы адзін дзень на працягу апошніх трох гадоў. Пустыя дамы будуць вызначаць камісіі пры візуальным аглядзе. Калі ўстановяць відавочную адсутнасць жыхароў на працягу доўгага часу, будзе правярацца наяўнасць аплаты камунальных плацяжоў, расходу электраэнергіі. У складзе камісій будуць і прадстаўнікі органаў унутраных спраў, якія апытаюць суседзяў, ці прыязджалі ў дом уласнікі або іншыя асобы, якія маюць правы валодання і карыстання ім. Матэрыялы апытання, фатаграфіі будуць прыкладацца да заключэння камісіі. На падставе праверкі ўсіх гэтых абставін мясцовыя выканкамы будуць прымаць рашэнне аб уключэнні дома ў рэестр пустуючых дамоў.

### Механізм вяртання

Мінімальныя тэрміны аднаўлення або зносу дамоў падаўжаюцца да года. Пры гэтым калі ва ўласніка былі ўважлівыя прычыны, якія перашкаджалі аднаўленню дома, то пра іх можна паведаміць выканкаму, і гэты тэрмін можа быць прадоўжаны.

У новым указе прапісаны і механізм магчымага вяртання ўласніку пустуючага або старога жылога дома, ужо перададзенага ў камунальную ўласнасць. Калі ўласнік не падаў паведамленне ў выканкам і ў яго былі на гэта ўважлівыя прычыны, невядомы мясцоваму выканкаму, то гэты дом павінен быць яму вернуты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Знайсці і абясшкодзіць

**Вынікі выканання работ па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага ў першым паўгоддзі былі разгледжаны ў рамках выязной калегіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, якая адбылася ў Лагойскім раёне.**

Рэгуляванне распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага адносіцца да мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі. Яго выканаўцамі з'яўляюцца мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя дзяржаўныя органы і арганізацыі. Мінпрыроды, як каардынатар, вядзе кантроль за выкананнем гэтых работ.

Па выніках палявых абследаванняў і навуковых даследаванняў, выкананых у 2017 годзе, усяго на тэрыторыі краіны па стане на 1 студзеня гэтага года ўстаноўлена 1148 карыстальнікаў зямельных участкаў і водных аб'ектаў, у якіх выяўлена 4534 месцы росту баршчэўніку Сасноўскага на плошчы 2924 гектараў. Найбольш інвазіраванай у краіне з'яўляецца Віцебская вобласць (Ушацкі, Гарадоцкі, Віцебскі, Браслаўскі, Талачынскі і Сенненскі раёны), на другім месцы па ступені небяспекі стаіць Мінская вобласць (Лагойскі, Мінскі, Валожынскі, Слуцкі, Пухавіцкі, Барысаўскі і Нясвіжскі раёны).

Работа па выкананні мерапрыемстваў па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага, якая праводзілася ў першым паўгоддзі гэтага года, дазволіла стабілізаваць сітуацыю па краіне, разам з тым не ў поўным аб'ёме выкананы заданні па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці гэтай расліны на тэрыторыі Віцебскай вобласці, паведамляе сайт Мінпрыроды.

Па стане на 1 ліпеня мерапрыемствы па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага ў цэлым па краіне праведзены на плошчы 2845,7 гектара ці 97,3 працэнта ад устаноўленага задання на першае паўгоддзе. За выключэннем Віцебскай вобласці (85 працэнтаў ад устаноўленага задання на 1-е паўгоддзе), ва ўсіх астатніх абласцях і Мінску азначанае заданне выканана ў поўным аб'ёме.

> Найбольш інвазіраванай у краіне з'яўляецца Віцебская вобласць, на другім месцы па ступені небяспекі стаіць Мінская вобласць.

Не забяспечана выкананне мерапрыемстваў па барацьбе з баршчэўнікам у поўным аб'ёме шэрагам прадпрыемстваў міністэрстваў лясной гаспадаркі, транспарту і камунікацый, сельскай гаспадаркі і харчавання, энергетыкі.

Варта адзначыць, што асноўнымі праблемамі ў частцы рэгулявання распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага з'яўляецца адсутнасць дакладных даных аб колькасці і плошчах росту гэтай расліны і неабходнасць устанаўлення дакладных межаў зямельных участкаў, на якіх выяўлены баршчэўнік Сасноўскага, для ўстанаўлення землекарыстальніка.

Мінпрыроды ўзяло на кантроль правядзенне мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі палявых абследаванняў для выяўлення новых месцаў росту баршчэўніку з мэтай наступнага фарміравання паказчыкаў рэспубліканскага плана мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі на 2019 год.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «ЗЯЛЁНЫЯ» НАСТУПАЮЦЬ



*(Працяг. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Паводле даных Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча, у краіне зарэгістравана 348 відаў чужародных раслін, якія займаюць плошчу больш за 64 тысячы гектараў. Найбольш агрэсіўнымі прызнаныя звыш 54 відаў, а 30 з іх адносяцца да так званых трансформераў — раслін, здольных прыводзіць да карэннай трансфармацыі экасістэм на значных тэрыторыях.

Каб той ці іншы від раслін назваць інвазійным, спецыялісты правяраюць, ці адпавядае ён пэўным крытэрыям: як хутка распаўсюджваецца, як уплывае на абарыгенныя віды, ці можа наносіць — цяпер і ў перспектыве — значную эканамічную шкоду (у 1 тыс. і больш базавых велічынь).

Да найбольш небяспечных інвазійных раслін на тэрыторыі Беларусі аднесены гіганцкія баршчэўнікі (Сасноўскага і Мантэгаці), сумнікі канадскі і гіганцкі, эхінацыстыс лопасцевы, клён ясеналісты і рабінія лжэакацыя. Усе яны ўключаны ў пералік відаў раслін, распаўсюджванне і колькасць якіх падлягаюць рэгуляванню.

## Гіганцкія парасонікі

Самую вялікую пагрозу нясуць два віды **баршчэўніку — Сасноўскага і Вільгельмса старая назва — Мантэгаці).** Гэтыя расліны нездарма адносяць да групы гіганцкіх: акрамя масіўнага сцябла, велізарных лісця і суквеццяў, яны маюць і магутную каранёвую сістэму, якая можа пранікаць на глыбіню да двух метраў.



— Гэтыя расліны ўтвараюць вялікую колькасць насення, якое захоўвае ўсходжасць ад некалькіх гадоў да дзесяцігоддзяў, — расказвае **Уладзімір ЛЯБЕДЗЬКА, навуковы супрацоўнік лабараторыі флоры і сістэматыкі раслін Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча.** — Калі своечасова не абкасіць баршчэўнік і даць яму сфарміраваць парасонікі, гэта прывядзе да «забруджвання» наваколля на вельмі доўгі час.

> Найбольш агрэсіўнымі прызнаныя звыш 54 відаў, а 30 з іх адносяцца да так званых трансформераў — раслін, здольных прыводзіць да карэннай трансфармацыі экасістэм на значных тэрыторыях.

Баршчэўнік, як вядома, выцясняе абарыгенныя віды раслін і жывёл, значна трансфармуе асяроддзе іх пражывання. Абодва віды ў сонечнае надвор'е выдзяляюць фуранакумарыны — рэчывы, якія, трапіўшы на скуру чалавека, пад уздзеяннем сонечных промняў выклікаюць моцныя хімічныя апёкі. Гэтыя расліны зніжаюць эстэтычную прывабнасць ландшафтаў, робяць немагчымым выкарыстанне зон адпачынку.

Сваё шэсце па Беларусі баршчэўнік Сасноўскага пачаў у 1955 годзе з... Цэнтральнага батанічнага сада Акадэміі навук. Так далёка ад сваёй радзімы (Каўказа) ён апынуўся дзякуючы насеннаму матэрыялу, які паступіў вучоным з Санкт-Пецярбурга. Першыя яго вытворчыя пасевы былі закладзены ў саўгасах Мінскага раёна, а потым і ў іншых рэгіёнах цэнтральнай часткі краіны. Менавіта таму сёння Мінская вобласць — адна з лідараў па распаўсюджанасці баршчэўніку.

Увогуле ж на тэрыторыі краіны выяўлена 4754 месцы росту гіганцкіх баршчэўнікаў агульнай плошчай звыш 3078 гектараў. 74 % іх размешчаны ў Віцебскай вобласці.

### ЯК ЗМАГАЦЦА З БАРШЧЭЎНІКАМ:

✓ некалькі разоў на год праводзіць скошванне раслін, не дапускаючы фарміравання парасонікаў і, адпаведна, насення;

✓ прымяняць гербіцыды, якія шкодна ўздзейнічаюць не толькі на расліну, але і на насенне, што трапіла ў глебу, глыбока пераворваць апошнюю некалькі разоў;

✓ праводзіць перазалужэнне шматгадовымі злакамі;

✓ для прадухілення распаўсюджвання баршчэўніку ў лясах ствараць загушчаныя лесакультуры з мясцовых відаў.

## З сумнікам сумна

Упершыню прадстаўнікі гэтых паўночнаамерыканскіх раслін былі адзначаны ў пачатку XX стагоддзя ў Навагрудскім раёне. А праз некаторы час пачалі распаўсюджвацца не толькі па кветніках, але і за межамі прысядзібных участкаў.

Сёння пагрозу наваколлю нясуць у асноўным два віды **сумнікаў — канадскі і гіганцкі.** Яны так падобныя адзін да аднаго, што адрозніць іх можа толькі спецыяліст. Але па сваім адмоўным уплыве расліны прыкладна раўназначныя.



— У 1990-я гады сумнікі былі вельмі папулярныя ў кветкаводстве, — расказвае Уладзімір Лябедзька. — Вырошчваючы сумнікі на сваіх участках, людзі не вельмі клапаціліся пра іх утылізацыю. Так насенне трапляла на пусткі, звалкі, узбочыны дарог, і паступова займала ўсё большыя тэрыторыі.

Па словах вучонага, у Беларусі пакуль не такая складаная сітуацыя, як, напрыклад, ва Украіне, але расслабляцца не трэба — і ў нас гэта расліна так трансфармуе некаторыя ўчасткі, што ў выніку там нічога, акрамя сумніку, не расце. У нашай краіне выяўлена больш за 1950 месцаў росту сумнікаў на плошчы 495 гектараў. Гэтыя расліны распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі, але асабліва шмат іх у Мінскай вобласці (95 % ад усёй іх плошчы). Асноўныя цэнтры рассялення — Мінскі, Смалявіцкі, Пухавіцкі і Маладзечанскі раёны.

### ЯК ЗМАГАЦЦА З СУМНІКАМ:

✓ шматразова скошваць расліну на працягу сезона. Пажадана выдаляць нават невялічкія парасткі;

✓ узворваць глебу ў месцах, дзе ён расце, а таксама праводзіць залужэнне мясцовымі злакамі;

✓ на прысядзібных участках абавязкова зразаць мяцёлкі суквеццяў да таго, як яны пачнуць бурэць. Калі гэтага не рабіць, расліны змогуць сфарміраваць насенне, якое хутка разнясецца па наваколлі. Зрэзаныя часткі расліны неабходна ўтылізаваць у кампостных ямах. Пры гэтым у кампост нельга выкідаць сырое карэнішча — трэба спачатку яго здрабніць і падсушыць ці спаліць.

### ШУКАЦЬ АГРЭСАРАЎ ДАПАМОГУЦЬ... КВАДРАКОПТАРЫ

Як расказалі ў прыродаахоўным ведамстве, гэтыя лятальныя апараты плануецца выкарыстоўваць пры абследаванні тэрыторый на прадмет росту інвазійных відаў раслін — баршчэўнікаў, сумнікаў і іншых. Іх вынікі дапамогуць тэрытарыяльным органам Мінпрыроды больш эфектыўна працаваць з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці гэтых відаў раслін.

■ Тэлесеткі

# У НАРОД ПА ТАЛЕНТЫ

**Маштабны дзіцячы тэлепраект «Талент краіны» трэці раз рыхтуецца да выхаду ў эфір, а напярэдадні праводзіць дадатковы набор удзельнікаў. Трапіць у апошні вагон конкурсу змогуць таленавітыя дзеці ва ўзросце 5—15 гадоў і калектывы (да 3 чалавек), якія займаюцца харэаграфіяй і выступаюць у арыгінальным жанры.**

Як распавялі «Звяздзе» на тэлеканале АНТ, які выступае адным з заснавальнікаў конкурсу, кастынг пройдзе ўжо на наступным тыдні, з 14 па 16 верасня, у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. 14—15 верасня з 10 да 18 гадзін адборачнае журы прагледзіць прэтэндэнтаў у намінацыі «Харэаграфія» (народная, класічная або сучасная), 16 верасня ў гэты ж час змогуць паказаць сябе прадстаўнікі арыгінальнага жанру («Акцёрскае майстэрства», «Мастацкая дэкламацыя», «Цыркавое мастацтва»). «Калі вы робіце нумар пад музыку, не забудзьцеся прыхапіць з сабой флэшку з патрэбнай музычнай кампазіцыяй», — нагадваюць арганізатары. Перавагу ў адборы будуць мець лаўрэаты і прызёры міжнародных конкурсаў, аднак па вялікім рахунку шанс гучна заявіць пра сябе гэтай восенню атрымае абсалютна кожны прэтэндэнт.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

Міжнародная федэрацыя шашак (IDF) з 25 жніўня па 4 верасня 2018 года ў пас. Кранева (Балгарыя) праводзіць камандны чэмпіянат свету па шашках-64. Спаборніцтвы праводзяцца паасобна сярод мужчынскіх і жаночых каманд па двух праграмах: класічнай і маланкавай. У першы дзень спаборніцтваў абедзве беларускія зборныя ў маланкавай праграме сталі пераможцамі чэмпіянату. За нашы каманды выступаюць міжнародныя гросмайстры Ігар Міхальчанка, Андрэй Валюк, Яўген Кандрачэнка і міжнародны майстар Сяргей Садоўскі ў мужчын, міжнародны гросмайстар Дар'я Федаровіч і міжнародныя майстры Вера Хвашчынская і Анастасія Барышава ў жанчын. Паралельна праходзіць яшчэ два чэмпіянаты свету сярод ветэранаў і сярод юніёраў.

## ШАШКІ («Звязда»)

Для самастойнага рашэння ў шашкі-64 прапануюцца кампазіцыі ўкраінскага майстра шашачнай кампазіцыі Анатоля Баланюка (г. Цепладар Адэскай вобласці).

**№ 59**




**№ 59**

**Белыя простыя шашкі:** a7, d4, e3, e5, f4, f6, g5 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, b4, c3, c7, f8, h6 (6).

**№ 60**

**Белыя простыя шашкі:** d4, e3, e5, g1, g5, h2, h4 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** a5, b2, b4, d8, e7, f2 (6).

У шашкі-100 мініяцюры складзеныя вядучым аддзела.

**№ 61**

**Белыя простыя шашкі:** 6, 7, 13, 32, 34, 41 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** 16, 21, 23, 24, 28, 31, 42 (7).

**№ 62**

— Нашы сумесныя дзеянні, у тым ліку з мясцовымі органамі ўлады, дапамаглі спыніць распаўсюджванне гэтай расліны, — расказвае **начальнік аддзела біялагічнай разнастайнасці Мінпрыроды Аляксандр ГІРАЕЎ.** — Але сёння неабходна больш актыўна працаваць і з іншымі інвазійнымі відамі — паступова набіраюць сілы сумнік канадскі і клён ясенялісты, рабінія лжэакацыя. Не дапусціць пашырэння арэалу гэтых відаў — наша галоўная задача.

З баршчэўнікам Сасноўскага як самай агрэсіўнай інвазійнай раслінай у флоры Беларусі змагаюцца ў межах рэалізацыі Рэспубліканскага плана мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі. На аснове палявых даследаванняў фарміруюцца заданні па рэгуляванні яго распаўсюджвання і колькасці. За кожны «захоплены» ўчастак адказваюць землекарыстальнікі.

— Тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды ўважліва сочаць за выкананнем плану на месцах і штодзённа падаюць гэту інфармацыю кіраўніцтву, — тлумачыць спецыяліст. — Калі землекарыстальнікі своечасова не праводзяць неабходныя мерапрыемствы па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага, яны прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці.

Барацьба ж з астатнімі небяспечнымі інвазійнымі раслінамі ідзе ў адпаведнасці з Палажэннем аб парадку правядзення мерапрыемстваў па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці відаў раслін, распаўсюджванне і колькасць якіх падлягае рэгуляванню.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы падчас палявых даследаванняў выяўляюць месцы росту гэтых раслін, распрацоўваюць і зацвярджаюць (штогод да 15 красавіка) раённыя планы адпаведных мерапрыемстваў.

Сёлета міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык узяў гэту працу на асаблівы кантроль. Згодна з яго даручэннем, тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды павінны прасачыць, каб мясцовыя ўлады ўключылі мерапрыемствы па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці сумнікаў канадскага, гіганцкага і іншых інвазійных раслін з пераліку ў раённыя планы на 2019 год. Неабходна таксама праверыць, наколькі поўна праведзены палявыя даследаванні на месцах.

— Толькі тады, калі ў мясцовых планах будуць пазначаны мерапрыемствы з усімі інвазійнымі раслінамі, якія ёсць на тэрыторыі раёна, гэтыя дакументы пройдуць узгадненне ў тэрытарыяльных органах Мінпрыроды, — падкрэсліў Аляксандр Гіраеў.

На барацьбу з інвазійнымі раслінамі выдзяляюцца сродкі як з мясцовых бюджэтаў, так і ўласныя сродкі землекарыстальнікаў. Але, на думку прадстаўніка Мінпрыроды, галоўнае не тое, колькі грошай выдзелена на правядзенне запланаваных мерапрыемстваў, а наколькі поўна і своечасова апошнія выконваюцца. Нават невялікае прамаруджанне дае час інвазійнай расліне вырасці, і тады, напрыклад, для яе эфектыўнай апрацоўкі будзе патрабавацца больш хімічных прэпаратаў, а значыць, і больш фінансавых сродкаў.

Сёння ў працэс барацьбы з інвазіямі актыўна ўключана і навука. У Інстытуце эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча вывучэннем «агрэсараў» займаюцца тры лабараторыі, у тым ліку кірунку працуе і Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі. Навукоўцы пры неабходнасці дапамагаюць мясцовым органам улады і землекарыстальнікам ацаніць распаўсюджанне інвазійных раслін і выбраць найбольш эфектыўныя спосабы барацьбы з імі.

Спецыялісты ўпэўнены: працаваць над вырашэннем гэтай праблемы трэба ўсім: навукоўцам, рэспубліканскім і мясцовым органам улады, землекарыстальнікам і кожнаму грамадзяніну. Бо сумесная барацьба тут не высокае слова — залог эфектыўнасці, а вось абыякавасць — галоўны фактар, які спрыяе распаўсюджванню інвазійных раслін і іх шкоднаму ўздзеянню на наша жыццё.

## АД АЛЕРГІІ ДА АСТМЫ

**Калі сярод інвазійных раслін у флоры Беларусі выбіраць тыя, што наносяць значную шкоду чалавеку, то тут другое і трэцяе месцы (пасля баршчэўнікаў) зоймуць амброзія палыналістая і цыклахена дурнічнікалістая.**

Амброзія палыналістая пакуль не ўваходзіць у пералік відаў, якія патрабуюць рэгулявання. Але цяпер у Мінпрыроды прапрацоўваюць гэта пытанне, бо расліна нясе сур'ёзную пагрозу здароўю чалавека.

Як і большасць агрэсіўных інвазійных раслін, амброзія — выхадзец з Паўночнай Амерыкі. Адзначаная ўпершыню ў Мазырскім раёне, сёння гэта расліна значна распаўсюдзілася і па іншых раёнах Гомельскай вобласці — Рэчыцкім, Гомельскім, Калінкавіцкім.

— Цвіце амброзія ў канцы лета — пачатку восені. Менавіта ў гэты час яна становіцца небяспечнай для людзей, бо яе пылок — адзін з наймацнейшых алергенаў, які выклікае сянную ліхаманку. Акрамя таго, яна ўнесена ў спіс каранцінных раслін, — расказвае **навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі Сяргей САЎЧУК.** — Каб выдаліць яе з прыроднага асяроддзя, неабходна прымяняць механічныя спосабы (праполку, пераворванне, выпальванне). Можна таксама выкарыстоўваць і гербіцыды, бо амброзія расце далёка ад вадаёмаў.

Па сваіх шкодных уласцівасцях падобная да амброзіі і цыклахена дурнічнікалістая, якая з 1970-х гадоў пачала актыўна распаўсюджвацца па поўдні краіны. Яна з'яўляецца прычынай масавых палінозаў (сезонных алергічных рэакцый) і нават здольная выклікаць вострыя страўнікавыя захворванні буйной рагатай жывёлы.

Для барацьбы з цыклахенай падыдуць вышэйназваныя спосабы ўтылізацыі амброзіі. Акрамя таго, трэба абавязкова ўтылізаваць фітамасу і не дапускаць цвіцення і плоданашэння расліны.

**Матэрыялы падрыхтавала Вераніка КОЛАСАВА.**

МЯСЦОВЫ ДОСВЕД

# ГЕРБІЦЫДАМІ І РЫДЛЁЎКАМІ

## Як у Чарнаўчыцкім сельсавеце Брэсцкага раёна баршчэўнік перамагаюць

**Вясной тут праводзілі суботнік. Высякаць баршчэўнік сабраліся дзясяткі людзей. Названая мясціна побач з аграгарадком Вістычы — асаблівая.**
**Побач размешчаны адзін з водазабораў абласнога цэнтра. Таму працаваць, напрыклад, з дапамогай гербіцыдаў нельга. Застаецца самы надзейны спосаб — рыдлёўка і рукі.**

Як паявіўся ў гэтым маляўнічым месцы баршчэўнік Сасноўскага, ніхто дакладна сказаць не можа. Уздоўж алеі, якая засталася ад былой панскай сядзібы, раптам сталі паднімацца зараснікі шкоднай расліны. Яны і раней тут альбо ў іншым месцы вясной вылазілі. Але ж гадоў дваццаць і больш таму любы свабодны лапік зямлі старанна выкошваўся, бо ў людзей на кожным падворку была карова. А там, дзе скошвалася і вытоптвалася трава, нічога непажаданага не расло. Цяпер па прычыне рэзкага памяншэння прыватнага статка сітуацыя памянялася і зялёны чужынец адчуў сябе вольна.

А гады два таму наогул здарыўся непрыемны інцыдэнт. Хлопчыкі малодшага школьнага ўзросту прыбеглі сюды пагуляць у вайну. Узброіўшыся палкамі, дзеці сталі збіваць высокія сцяблíны «зялёнага ворага». Пасля гэтага ўсе малыя «ваяры» атрымалі такія апёкі, што давялося кожнаму прайсці курс лячэння ў бальніцы. Вось і пачалося мэтанакіраванае вынішчэнне зялёнай навалы і ў Вістычах, і ў іншых вёсках.

— Сёлета вырашана было выкарчаваць шкодную рас-



Старшыня Чарнаўчыцкага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр САЛАНЕВІЧ паказвае тэрыторыю, якую ачысцілі на суботніку.

ліннасць да адзінага каліва, — расказвае **старшыня Чарнаўчыцкага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр САЛАНЕВІЧ**. — На наш заклік адгукнуліся многія прадпрыемствы і ўстановы. І ў вызначаны дзень на пляцоўцы побач з водазаборам сабраліся работнікі водаканала, прадстаўнікі абласной і раённай устаноў аховы прыроды, супрацоўнікі сельвыканкама і сельгаспрадпрыемства. Мы сталі ў рад і выкапалі з каранямі кожную расліну. Цікава, што корань баршчэўніку знешне вельмі нагадвае корань жэнь-шэню. Выкопвалі старанна і ўважліва, каб не пакінуць у зямлі нават малых карэньчыкаў. Расліны потым вывезлі на палігон і ўтылізавалі. І вось цяпер, амаль праз паўгода, дзе-нідзе з зямлі выглядваюць асобныя парасткі. Такая гэта каварная рэч. Але перад зімой зноў усё вычысцім. І думаю, налета гэту тэрыторыю можна будзе лічыць чыстай.

Пад'язджаем да электрападстанцыі, і кіраўнік мясцовай улады расказвае, што тут непажаданую расліну літаральна выпалілі з карэннем з дапамогай ядахімікатаў. Аказваецца, у гэтым месцы зараснікі былі ў рост чалавека, нібы ў джунглях. Склалася ўражанне, што на кожным квадратным сантыметры расце баршчэўнік... Цяпер тут таксама вылазяць парасткі, але ўжо на некалькі квадратных метраў можна заўважыць усяго адзін.

Летась падобную работу праводзілі ў Чарнаўчыцах. Сёлета намаганні па знішчэнні шкоднай расліны прыклалі ў вёсках, якія адносяцца да сельгаспрадпрыемства «Агра-сад «Рассвет» — маюцца на ўвазе аграгарадок Вістычы і вёска Казловічы. На набыццё гербіцыдаў у гэтым годзе выдзелена з раённага бюджэту 2000 рублёў. Летась такая ж сума выдзялялася на работу ў чарнаўчыцкай зоне.

**Галоўны аграном ААТ «Аграсад «Рассвет» Алег ЦЫОЛТА** гаворыць, што найбольшы эфект яны атрымалі, калі пачалі працаваць з гербіцыдамі «тэрсан», «кілеа». Можна нават змешваць ядахімікаты, якіх баіцца гэтая расліна. Алег Аляксандравіч згадвае, што яшчэ 5-6 гадоў таму на ўзбочынах дарог, па берагах меліярацыйных каналаў, на пустках і няўдобіцах баршчэўніка Сасноўскага было даволі шмат. Цяпер ад той колькасці застаецца літаральна 1-2 працэнты. І гаспадарка будзе рабіць усё магчымае, каб пазбавіцца ад яго зусім, бо калі страціць пільнасць...

— Мы можам назіраць сумны вопыт суседзяў у блізкім замежжы, — гаворыць Алег Цыолта. — Мне давадзілася бачыць, як зараснікі баршчэўніку ўздоўж узбочын дасягаюць трох метраў у вышыню. Там ужо давядзецца патраціць вялікія сродкі на барацьбу. А кожнае пападанне насення ў глебу павялічвае шанцы расліны. Насенне можа ўзрасці і праз гады.

Старэйшыя людзі ў Вістычах згадалі, што гэты злашчасны баршчэўнік завезлі ў суседні калгас і вырошчвалі ў якасці кармавой культуры. Але хутка адмовіліся, бо каровы сталі даваць горкае малако. Адмовіцца адмовіліся, а выкараніць не змаглі да гэтай пары...

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Пётр БРЫШ, начальнік Брэсцкай гарадской і раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Мы трымаем пад кантролем усе ачагі прарастання баршчэўніку Сасноўскага. У суме па вёсках Брэсцкага раёна шкодная расліна займае плошчу 5,8 гектара. Да нядаўняга часу яго было шмат на тэрыторыі Чарнаўчыцкага сельсавета. Занепакоенасць выклікаюць плантацыі ў асобных вёсках Мухавецкага сельсавета, сустракаецца непажаданая расліна на землях ляснога фонду, асабліва ахвотна яна расце ўздоўж меліярацыйных каналаў. Апошняе становіцца клопатам ПМК меліяратараў. Мы рэкамендуем гаспадарнікам у барацьбе з праслінай выкарыстоўваць гербіцыды, гэта найбольш дзейсны спосаб знішчэння. Бо, напрыклад, у вёсцы Падлессе Радваніцкае баршчэўнік скошвалі ўжо пяць разоў, а ён зноў расце. Вельмі жывучае яго насенне, знішчыць якое ядахімікатамі больш шанцаў.

Яшчэ хачу звярнуць асаблівую ўвагу на праблему сумніку. Некаторыя грамадзяне ўзялі за моду вырошчваць яго ў якасці дэкаратыўнай культуры. Расліну з дробнымі жоўтымі кветачкамі можна сустрэць каля клубаў і магазінаў. Гэта няправільная і шкодна. Развядзём чужынца — будзем мець такія ж праблемы, як з баршчэўнікам.


**Извещение о проведении 25 сентября 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БЕЛРЫБА»**

| Предмет торгов |
|---|
| Здание многофункциональное – А 4/к Административно-бытовое здание (инв. № в ЕГРНИ 500/С-29686, общая площадь – 1209 кв. м). Здание неустановленного назначения – Одноэтажное ж/б каркасное здание (блок вспомогательных цехов) (инв. № в ЕГРНИ 500/С-29688, общая площадь – 746 кв. м). Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ – Б 1/кп-м Здание холодильника (инв. № в ЕГРНИ 500/С-29193, общая площадь – 1826 кв. м). Капитальное строение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ – Д 1/К Склад масел и аммиака (инв. № в ЕГРНИ 500/С-29684, общая площадь – 68 кв. м). Здание специализированное иного назначения – Компрессорный цех (инв. № в ЕГРНИ 500/С-64435, общая площадь – 50,8 кв. м). Здание неустановленного назначения – Здание дежурного (инв. в ЕГРНИ №500/С-64436, общая площадь – 7,9 кв. м). Металлический блок-модуль размер 6*3*2,5м (инв. № 001.00.06.1393). Туалетная кабина «Стандарт» в сборе (инв. № 001.00.08.2179). Сооружение специализированное коммунального хозяйства – Тепловые сети (инв. № в ЕГРНИ 500/С-1022483). Электрокабельная линия (инв. № 003.00.85.142). Автопарковка (инв. № 002.00.09.2768). Вывеска надкрышная с буквами объемными и неоновым наполнением (инв. № 007.00.09.3040). Гостевая автостоянка (инв. № 002.00.09.2709). Сооружение специализированное железнодорожного транспорта – железнодорожный путь (инв. № 002.00.85.118). Ограждение территории (инв. № 002.00.85.121). Сооружение специализированное коммунального хозяйства – Ливневая канализационная сеть (очистные сооружения) (инв. № в ЕГРНИ 500/С-1022484). Перегородка металлическая (инв. № 002.00.09.2658). Сооружение специализированное железнодорожного транспорта – Подъездная железнодорожная ветка (инв. № 002.00.86.122). Проезды и площадка (инв. № 002.00.86.123). Проезды и площадки (инв. № 002.00.85.119). Связь (инв. № 002.00.86.124). Сеть радиофикации (инв. № 002.00.86.125). Шлагбаум (инв. № 002.00.09.3037). Шлагбаум (инв. № 002.00.09.3038). Озеленение (инв. № 009.00.86.433). Автоматический сигнализатор паров аммиака АСПА-01М (инв. № 004.15.05.1037). Автоматический сигнализатор паров аммиака АСПА-01М (инв. №004.15.05.1011). Аппаратно-программный комплекс (инв. № 004.21.07.1983). Камера КХН 7,71 (инв. № 007.00.09.2927). Кнопка тревожной сигнализации компрессорный, участок Радиальная, 56 (инв. № 004.00.09.3042). Кондиционер AQ18A41ME (инв. № 004.18.08.2157). Кондиционер EACS 12HD (инв. № 004.15.09.2958). Кондиционер LG S07LHP к.404 (инв. № 004.21.06.1325). Кондиционер LG S09LHP к.301 (инв. № 004.21.06.1327). Кондиционер LG S09LHP к.303 (инв. № 004.21.06.1326). Кондиционер LG S12LHP конф. зал (инв. № 004.00.06.1264). Кондиционер LG S18LHP к. 309 (инв. № 004.00.06.1267). Кондиционер LG SO7LHP к.101-транспорт (инв. № 004.00.06.1258). Кондиционер LG SO7LHP к.204 (инв. № 004.21.06.1262). Кондиционер LG SO7LHP к. 308 (инв. № 004.00.06.1253). Кондиционер LG SO7LHP к.310 (инв. № 004.00.06.1254). Кондиционер LG SO7LHP к.312 (инв. № 004.00.06.1255). Кондиционер Midea MCA-48HR (магазин Рад) (инв. № 004.21.07.1439). Кондиционер Midea MCA-48HR (магазин Рад) (инв. № 004.21.07.1438). Кондиционер MUB 36 HR ОБ-202-КОНД (инв. № 004.15.10.3093). Кондиционер ACS-127 HR к.101 (инв. № 004.00.08.2070). Контрольно-пропускная система с парковочным модулем (инв. № 004.00.08.2281). Локальная система оповещения «Белрыбы» (инв. № 004.15.07.2030). Охранная сигнализация (инв. № 004.17.06.1250). Пожарная автомная сигнализация и система оповещения (инв. № 004.00.09.2681). Полугерметичный поршневой компрессор 4CC-6,2Y (инв. № 004.00.09.2477). Прибор учета ТЭМ-05М2 и системы РТМ-02 Струмен (инв. № 004.00.03.699). Система видеонаблюдения № 2 ул. Радиальная, 56 (инв. № 007.00.08.2194). Система газоанализаторных извещателей на утечку аммиака Камеры замораживания ул. Радиальная 56 (инв. № 004.17.09.2987). Система наблюдения ул. Радиальная, 56 (инв. № 004.21.06.1280). Структура «Неман 250» 2ОВ-800100-22 2-уров. с подсветкой (инв. № 004.00.08.2419). Структура «Неман 250» 2ОВ-800100-22 2-уров. с подсветкой (инв. № 004.00.08.2418). Здание специализированное энергетики – трансформаторная подстанция (ТП №1372) инв. № 500/С-64700, общая площадь – 46,4 кв. м, (инв. № 004.03.85.415). Узел учета теплоэнергии (инв. № 004.17.05.1164). Холодильная витрина «Двина 120» ВСн-0,37-0,9-2-4Е (инв. № 004.00.08.2420). Холодильная витрина «Двина 120» ВСн-0,37-0,9-2-4Е (инв. № 004.00.08.2421). Холодильная витрина «Неман 375 П» ВС-2,8-12,2-2-1Г (инв. № 004.00.08.2417). Холодильная витрина «Неман 375 П» ВС-2,8-12,2-2-1Г (инв. № 004.00.09.2416). Холодильная витрина «Неман 240» ОВ ВН-1,3-4,1-2-ОХ (инв. № 004.00.09.2414). Холодильная витрина «Неман 240» ОВ ВН-1,3-4,1-2-ОХ (инв. № 004.00.09.2415). Холодильное оборудование (инв. № 004.12.85.398). Вывеска Белрыба (входная административная) (инв. № 004.00.09.2546). Дюралайт с контролером (инв. № 004.00.10.3126). Козырек технологический 4000мм (инв. № (инв. № 004.00.09.2547). Перегородка шестисекционная с 2-мя дверями (инв. № 002.00.09.3035). Полотно на банерной сетке (инв. № 007.00.09.2776). Стеллаж 10000*250 (инв. № 007.00.03.700). Стеллажная система Склад № 1, ул. Радиальная, 56 (инв. № 004.00.07.1432). Стеллажная система на 210 паллетомест (инв. № 004.00.08.2053). Флагшток Nordic с перекладиной 9 м (инв. № 007.00.08.2255). Флагшток Nordic с перекладиной 9 м (инв. № 007.00.08.2256). Флагшток Nordic с перекладиной 9 м (инв. № 007.00.08.2257). Шкаф комбинированный (инв. № 007.00.05.3149). Штора ПВХ 2,7*2,8 м (инв. № 007.00.10.3149). Штора ПВХ 2,7*2,8 м (инв. № 007.00.10.3150). Штора ПВХ 2,7*2,8 м (инв. № 007.00.10.3151). Штора ПВХ 2,7*2,8 м (инв. № 007.00.10.3152). Холодильник Sharp NBE-641 (инв. № 007.00.08.2212). хозяйственно-бытовая канализация (инв. № 003.00.85.141) |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Радиальная, 56 |
| Начальная цена – 5 401 785,50 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 540 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества** – ОАО «БЕЛРЫБА», 220024, г. Минск, пер. Стебенева, 2, тел. (017) 365-79-24.

**Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов** – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛРЫБА», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, не позднее окончания срока приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 25 сентября 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 07.09.2018 по 21.09.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 201-99-72 (ОАО «БЕЛРЫБА»)

НА СВАЕ ВОЧЫ

# ШКОДНАЯ КВЕЦЕНЬ КАЛЯ МУРОЎ

## Сумнік бярэ ў кола старажытны Свяцк

**ІНВАЗІЙНАЯ расліна ўжо ахапіла ўзбярэжжа некалькіх вадаёмаў. Вось-вось жоўтая квецень падступіць да старой алеі, якая захавалася з даўніх часоў. А там і да самога палаца недалёка...**

### Ён ужо набліжаецца

Палацава-паркавы комплекс «Свяцк» на Гродзеншчыне называюць жамчужынай Прынёманскага краю. І нездарма. Былы палац магнатаў Валовічаў будаваўся па праекце італьянскага архітэктара Джузепэ Сака ў другой палове XVIII стагоддзя. Старажытнаму будынку амаль 240 гадоў. Зараз тут вядуцца маштабныя работы па рэканструкцыі.

Непаўторны выгляд замку надае навакольная прырода. Асабліва ўражваюць вадаёмы і старажытная алея з векавымі дрэвамі. Але... гэтыя мясціны апанаваў сумнік канадскі — расліна, якая ўнесена ў рэестр інвазійных відаў, распаўсюджванне і колькасць якой падлягаюць рэгуляванню.



Возера пад уплывам сумніку.

Як паведамілі ў Гродзенскім абласным камітэце аховы прыроды, менавіта каля Свяцка сумнік пачаў распаўсюджвацца вельмі хутка. Літаральна за год тут з'явіліся сапраўдныя зараснікі. Яны пачынаюцца ад трасы, якая вядзе да палацавага комплексу, і «атачаюць» азёры. З-за гэтых жоўтых плантацый вадаёмы набылі запушчаны выгляд, хоць некалькі гадоў таму тут праводзілася вялікая работа па добраўпарадкаванні берагоў і навакольнай тэрыторыі. Расліна літаральна сцяной падступае і да старажытнай алеі. Калі сумнік падыдзе да стагадовых дрэў, знішчыць яго будзе цяжка з-за шчыльнай пасадкі.

Ці не апынецца ў зарасніку і сам палац? Дарэчы, ён праходзіць рэканструкцыю — пад турыстычна-забаўляльны комплекс з гасцініцай, рэстаранам, катаннем на брычках, пракатам веласіпедаў, лодак і шэрагам іншых відаў адпачынку. Праўда, на аб'екце паведамілі, што хутка пачнецца добраўпарадкаванне тэрыторыі, магчыма, дабярэцца і да шкоднага сумніку.

### Перайшоў на агароды

Свяцк — гэта яшчэ і невялікая вёска каля палацавага комплексу. Алея выводзіць на дарогу, якая вядзе да населенага пункта. Відаць, што жоўтыя сукавецці красуюцца і каля агародаў і нават парасці на мяжы, якая раздзяляе ўчасткі. Мясцовыя жыхары стараюцца не дапусціць расліну на свае градкі. Сабіна Феліксаўна, якой ужо 70 гадоў, сама абкошвае тэрыторыю каля ўчастка, але гаворыць, што сумнік вельмі хутка расце. І сапраўды, згодна з даведкай камітэта аховы прыроды, кожны куст стварае да 100 тысяч адзінак насення, якое мае вельмі высокую ўсходжасць — 95 %.



Жыхарка Свяцка Сабіна ФЕЛІКСАЎНА паказвае зараснікі сумніку каля агарода.

> «Дарэчы, скошваць расліну рэкамендуецца даволі часта — 3-4 разы за сезон. Можна абмежавацца і адным скошваннем — тады рабіць гэта трэба ў другой палове жніўня, да паспявання насення. У гэтым выпадку скошаную траву трэба ўтылізаваць.

Сабіна Феліксаўна не ведае, калі апошні раз тут абкошвалі тэрыторыю. Зрэдку такія работы вядуцца. Але сёлета такіх захадаў, па яе словах, ніхто не рабіў. Не бачылі касцоў і жыхары суседняга дома. Можа, таму, што вёска зусім малая — усяго сем дамоў, а можа, з-за шырокамаштабнай будоўлі палацавага комплексу... А між тым у канцы вёскі сумнік ужо разросся даволі буйна: ён апанаваў былы сад, поўнасцю ахапіў поле. Зараз ужо не зразумець, што тут расло раней, якое прызначэнне мела гэта зямля і наогул, ці будзе тут яшчэ што-небудзь расці? Эколагі лічаць, што гэты від небяспечны для асяроддзя, і хоць ён не пагражае здароўю, як баршчэўнік, але выцясняе звыклую для гэтых мясцін флору і фауну.

### Як гэта спыніць?

Часткова плошчы пад сумнікам належаць Сапоцкінскаму пасялковаму Савету. Яго старшыня Лілія Шаматовіч лічыць, што сумнік прыжыўся з-за свайго дэкаратыўнага выгляду. Яго нават высаджвалі некалі на магілках і ўласных палісадніках. А зараз гэты від патрабуе кантролю.

Дарэчы, скошваць расліну рэкамендуецца даволі часта — 3-4 разы за сезон. Можна абмежавацца і адным скошваннем — тады рабіць гэта трэба ў другой палове жніўня, да паспявання насення. У гэтым выпадку скошаную траву трэба ўтылізаваць. Там, дзе сумнік займае значныя плошчы, эфектыўным будзе пераворванне глебы і падсеў шматгадовых траў. Хімічны метад, раяць эколагі, лепш выкарыстоўваць для маладых раслін вышынёй 10—15 сантыметраў.

На думку Ліліі Шаматовіч, сумнік займае тыя плошчы, якія не выкарыстоўваюцца. Калі іх заараць і акультурыць, расліна сама сабой знікне. Абкошванне не дае патрэбных вынікаў, хоць яно і праводзіцца. Дарэчы, Сапоцкінскі пасялковы Савет — далёка не адзіны, дзе разросся сумнік, яго хапае і па ўсім Гродзенскім раёне.

Значныя плошчы расліна займае ў Ваўкавыскім раёне. У мясцовай экалагічнай інспекцыі расказалі, што зараз збіраецца інфармацыя аб месцах распаўсюджвання шкоднага віду. Ужо відавочна, што сумнік апанаваў тыя вёскі, дзе шмат пустых дамоў. Раней гэту зямлю апрацоўвалі самі сяляне, зараз жа яна з'яўляецца добрым «плацдармам» для распаўсюджвання інвазійных відаў. Дарэчы, да іх адносяцца не толькі сумнік і баршчэўнік, але і клён, канапля, мак, ілжэакацыя, эхінацысціс.

Трэба сказаць, што плошчы баршчэўніку за апошнія чатыры гады знізіліся на 50 га і складаюць 134 га па вобласці. Напэўна, свой плён дала адпаведная пастанова ўрада, прынятая ў 2016 годзе. На яе аснове быў зацверджаны абласны план. Сумнік жа, наадварот, пачаў хутка запаўняць палі і лугі.

У Ваўкавыскай інспекцыі адзначылі, што гэты від пачаў наступленне і на лясы, асабліва на маладыя пасадкі. Ёсць участкі, дзе нават не відаць высаджаных дрэўцаў. Зразумела, што ў такіх умовах цяжка весці з ім барацьбу — абкошваць ці апрацоўваць глебу, бо можна загубіць маладыя дрэвы. У лесе пад татальным жоўтым покрывам амаль нічога не расце — ні грыбы, ні ягады.

Як правіла, барацьба з інвазійнымі відамі вядзецца ў межах добраўпарадкавання тэрыторый. Але цяпер сітуацыя значна пагоршылася — і ў першую чаргу з-за распаўсюджвання сумніку. Праблема набывае, можна сказаць, дзяржаўны размах. Мясцовыя ўлады тэрмінова пачалі інвентарызацыю расліны. Маштабы яе распаўсюджвання сапраўды ўражваюць. Асабліва выклікаюць занепакоенасць выпадкі, калі шкодная расліна пачынае гаспадарыць у населеных пунктах альбо псуе наваколле старажытных пабудоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Узденское РАЙПО, Минская обл., г. Узда, пер. К. Маркса, 7 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**

| **Наименование** Назначение | **Общ. пл.** | **Инв. номер** |
|---|---|---|
| **Административное здание, кондитерский цех** Здание административно-хозяйственное | 646,2 кв. м | 623/С-58122 |
| **Адрес** | Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пл. Свободы, 9 | |
| **Составные части и принадлежности** | Подвал, кирпичная пристройка | |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 0,1481 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания административно-производственного здания. Ограничения (обременения) прав: охранная зона ЛЭП до 1000 вт, площадь – 0,0104 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **44 098,82 белорусского рубля (снижена на 80 %)** | |

**Лот № 2**

| | | |
|---|---|---|
| **Здание магазина** Здание специализированное розничной торговли | 188,5 кв. м | 623/С-58402 |
| **Адрес** | Минская обл., Узденский р-н, Хотлянский с/с, д. Любяча, ул. Центральная, 80 | |
| **Сведения о земельном участке** | Предоставлен Продавцу общ. пл. 0,1395 га, на праве постоянного пользования для обслуживания магазина. | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **12 115,07 белорусского рубля (снижена на 40 %)** | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 25.07.2018 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **27.09.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **25.09.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Несвижское РАЙПО, Минская обл., г. Несвиж, ул. Советская, 5/1 |

**Предмет аукциона**

| **Наименование, общая площадь, инвентарный номер** | **Назначение** | **Адрес** |
|---|---|---|
| **Магазин «Уцененный»,** 78,1 кв. м, 621/С-21696 | Здание специализированное розничной торговли | Минская обл., Несвижский р-н, г. п. Городея, ул. Шоссейная, 8Б |
| **Составные части и принадлежности** | Пристройка, крыльцо, сарай № 1, сарай пристройкой № 2 | |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок общей площадью 0,0316 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания магазина «Уцененный» | |

**Начальная цена с НДС 20 % – 3 720,00 бел. руб. (снижена на 50 %)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10 (десяти)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 25.07.2018

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **19.09.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **17.09.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |



**ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ**
**по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2-я очередь строительства). Жилой дом № 16 по генплану», опубликованной в газете «Звязда» № 193 (28557) от 06.10.2017**

«Предполагаемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию – 5 ноября 2018 года».

УНП 192400611



Утерянный бланк страхового полиса формы 2РН, 2 РП, серия КЕ № 0108086, ЗАСО «КЕНТАВР» считать недействительным.

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## БЛІЖЭЙ ДА ПРЫРОДЫ

**Абласны экалагічны фэст «Гамоняць пушчы беларускія...» стаў візітнай карткай Свіслацкага раёна. Паўдзельнічаць у ім арганізатары запрашаюць усіх ахвотных, але асабліва рады сваім суседзям. Таму прадстаўнікі Берастаўіцкага раёна — у ліку пастаянных гасцей.**

Тамара Касьян, загадчыца аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры раённага цэнтра культуры і народнай творчасці, правяла на мерапрыемстве майстар-клас па асновах саломапляцення. Таксама ў рамках фестывалю адбылося падвядзенне вынікаў абласной выстаўкі-конкурсу пано з прыроднага матэрыялу пад назвай «У гармоніі з прыродай». Твор мастачкі адзначаны дыпломам II ступені.

## ПРАФЕСІЯ БЕЗ ВЫПАДКОВЫХ ЛЮДЗЕЙ

**На працягу 14 гадоў Любоў Аўдзеюк працуе сацыяльным работнікам Маларыцкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Карэспандэнт мясцовай газеты «Голас часу» сустрэўся з ёй каля крамы ў вёсцы Збураж, дзе яна закупляе прадукты для васьмі сваіх падапечных.**

У асноўным пад наглядам Любові Аўдзеюк бабулі, якім больш за 70 гадоў. Кожнай неабходна не толькі прынесці прадукты ці лекі, але і прыбраць у хаце, дапамагчы з дровамі, прыгатаваць ежу, памыць адзенне, калі трэба. Заглядвае да іх яна тры разы на тыдзень, але штодзень яшчэ сазвоньваецца. Многія падапечныя пражываюць у дамах без выгод, сама ж сацработнік таксама ўжо на пенсіі і ў снежні адзначыць юбілей — 60 гадоў. На пытанне, што самае цяжкае ў яе прафесіі, адказвае так: «Страчваць людзей, пра якіх ты клапаціўся не адзін год, з якімі зрадніўся душой. На жаль, шэсць маіх падапечных пайшлі з жыцця. Калі ў памерлага няма блізкіх сваякоў, пахаванне арганізоўвае сацыяльная служба».

## АДПАЧЫЛІ НА БУЛЬБАФЭСЦЕ

**У рамках раённага праекта Дзятлаўшчыны «Дбайных людзей славім — весела час бавім» у аграгарадку Хвінявічы прайшло Свята бульбы. На ім пабываў і карэспандэнт газеты «Перамога».**

Са шчырымі словамі прывітання і віншавання звярнуўся да землякоў і гасцей свята старшыня Парэцкага сельвыканкама Аляксандр Ядэйка. Ён пажадаў вяскоўцам мець штогод багатыя ўраджаі «другога беларускага хлеба», а ў час святочнага мерапрыемства — добра адпачыць ад штодзённага клопату.

Выклікала шчырае захапленне і ў дзятвы, і ў дарослых прадстаўленне ў выкананні артыстаў Дзятлаўскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці пад назвай «Гасцёўня БульбаЁсціка». У час свята ладзілася дэгустацыя бліноў і іншых традыцыйных страў, выстаўка творчых работ навучэнцаў, супрацоўнікі Дзятлаўскай раённай бібліятэкі прадставілі часопісы з рэцэптамі розных страў з бульбы. Пастараліся арганізатары свята і для самых маленькіх удзельнікаў мерапрыемства: працавалі надзіманыя горкі, батуты, цір, карусель, рознакаляровы Color Fest.

Хутка на старт паклікаў раённы этап рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла — 2018». Удзел у спартыўных спаборніцтвах прынялі чатыры сям'і: Абражэй з вёскі Гірычы, Санцэвіч і Муха з Хвінявічаў, Качмарык з Вензаўца. Сем'і актывізавалі ўсе свае сілы і кемлівасць, спрытна дапамагалі дарослым дзеці. Па выніках усіх выпрабаванняў перамогу атрымала сям'я Качмарык.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# Альтанкі для сталых...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Сёння ўжо пяць двароў у самым буйным раёне горада над Сожам развіваюцца дзякуючы таму, што іх жыхары аддалі невялікую частку свайго прыбытку на агульную справу, знайшлі падтрымку ў раённай адміністрацыі і дэпутатаў. Пачынаў гэты рух у раёне камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Сонечны».

Цяпер яго старшыня Ірына Піскун прыехала на сход жыхароў, каб адказаць на пытанні людзей. Ірына Мікалаеўна прызналася, што першымі быць няпроста. Пакуль працэс пайшоў, толькі ў КЖРЭУП «Савецкае» прыйшлося напісаць 14 лістоў. Затое не дарэмна. У пачатку года двор КТГС «Сонечны» прызнаны найлепшым у Гомелі і вобласці. На новай пляцоўцы правялі ўжо пяць раённых дзіцячых свят, а ў звычайныя дні гуляць на Давыдаўскую вуліцу прыходзяць дзеці з усяго мікрараёна.

На Мінскай вуліцы на сход прыйшло няшмат мам і татаў. Затое бабуль і дзядуляў было дастаткова. Дарэчы, менавіта яны і з'яўляюцца асноўным насельніцтвам гэтага мікрараёна.



Падчас сходу жыхароў.

Дырэктар камунальнага прадпрыемства Міхаіл Прус заўважыў, што арэлі ці горка — не самае галоўнае ў праекце добраўпарадкавання двароў тэрыторыі. Рашэнне пра закуп абсталявання ў любым выпадку будуць прымаць жыхары. І калі на Давыдаўскай двор разбілі на зоны для дзяцей малодшага і падлеткавага ўзросту, то ў іншым месцы могуць арганізаваць пляцоўкі для адпачынку не толькі дзяцей, але і людзей сталага ўзросту. Для гэтага можна паставіць прыгожыя лаўкі і альтанкі.

Тым, хто хоча на свае вочы пераканацца, як гэта ўжо зроблена на іншых тэрыторыях, кіраўнік КЖРЭУП прапанаваў арганізаваць паездку ва ўжо добраўпарадкаваныя жыхарамі двары. Шмат пытанняў было пра збор сродкаў, кантроль за іх выкарыстаннем. Людзі ўдакладнялі, які канкрэтны ўнёсак зробяць камунальныя службы. Адразу прымаць рашэнне жыхары пакуль не сталі. Вырашылі, што праз пэўны час правядуць яшчэ адзін сход і тады ўжо агучаць агульны настрой суседзяў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ПРАЕКТ

# ЧЫМ ПАГРАЖАЕ ХАТНЯЯ ХІМІЯ?

## Шведы будуць даследаваць беларускія сцёкі

**Праект, нацэлены на змяншэнне паступлення небяспечных хімічных рэчываў у сцёкавыя воды, яшчэ мала распаўсюджаны ў нашай краіне. Але ў яго кіраўнікоў вялікія планы на Беларусь.**

Пад слоганам «Бяспечныя тавары, бяспечныя гарады» першапачатковы праект NonHazCity аб'яднаў 18 партнёраў у рэгіёне Балтыйскага мора, уключаючы мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады, навукова-даследчыя інстытуты, прадпрыемствы, якія ажыццяўляюць ачыстку сцёкавых вод, і іншых. На працягу праектнага перыяду партнёры маюць магчымасць самастойна выяўляць крыніцы небяспечных рэчываў, вызначаць іх прыярытэтнасць і ўдзельнічаць у распрацоўцы планаў дзеянняў па хімічнай бяспецы для гарадоў, каб дапамагчы ім змагацца з гэтымі выкідамі.

Дзейнасць праекта сканцэнтравана на малых і сярэдніх прадпрыемствах і падсобных гаспадарках. Апошнія могуць праверыць сваю тэрыторыю і даведацца, якія небяспечныя хімічныя рэчывы ёсць на ўчастках. Такім чынам шырокая грамадскасць будзе ўцягнутая ў інфармацыйна-асветніцкую кампанію і атрымае неабходныя экалагічныя матэрыялы. Спецыялісты ўпэўнены, што толькі інфармаваныя грамадзяне ў стане выправіць сітуацыю, якая склалася, змяніўшы спажывецкія паводзіны на экалагічныя.

— У рамках згаданага праекта мы правялі скрынінг небяспечных хімічных рэчываў і даведаліся, адкуль яны бяруцца і як трапляюць у водныя аб'екты, — расказала прадстаўніца ўпраўлення навакольнага асяроддзя і аховы здароўя муніцыпалітэта Стакгольма, **менеджар праекта Тоні ВІКМАН.** — Найбольшую цікавасць для вывучэння ў Беларусі ўяўляюць Вілейка і Іўе. На жаль, даных пра колькасць і склад небяспечных рэчываў з гэтых раёнаў пакуль няма, але мы плануем правесці даследаванні, якія дапамогуць сабраць неабходную інфармацыю.

Небяспечныя рэчывы — гэта цяжкія металы, арганічныя рэчывы і фармацэўтычныя прэпараты. Пра шкоду металаў вядома даўно, пра іншыя рэчывы даных менш. Многія з іх адзначаны ў Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках як рэчывы, колькасць якіх трэба кантраляваць і зніжаць іх канцэнтрацыю. Яны ўплываюць на здароўе і могуць пашкодзіць эндакрынную сістэму, справакаваць алергічныя рэакцыі, выклікаць праблемы з памяццю і г. д.

— Не варта забываць, што гэтыя рэчывы ўплываюць не толькі на людзей, але і на прадстаўнікоў фауны, у прыватнасці на рыб, — адзначае Тоні Вікман. — Праблема ў тым, што нават пры малых канцэнтрацыях гэтыя рэчывы аказваюць негатыўнае ўздзеянне.

Удзельнікі праекта даследавалі метал кадмій, алкілфенолы, нанілфенолы і актылфенолы, фталаты, бісфенол А, фармацэўтычныя прэпараты дзіклафенак, эстрадыёл, этынілэстрадыёл (не ўсе рэчывы, прааналізаваныя ў скрынінгу NonHazCity, уздзейнічаюць на эндакрынную сістэму, у гэтым матэрыяле прыведзены толькі тыя, якія аказваюць такое ўздзеянне. — **Аўт.**).

Былі сабраны пробы сцёкавых вод з жылых і прамысловых раёнаў (і з некаторых прадпрыемстваў), ліўневых сцёкаў, воды са станцыі водаачысткі і асадкі сцёкавых вод. Пробы прааналізавалі ў лабараторыях Гданьскага і Шведскага сельскагаспадарчага ўніверсітэтаў.

Спецыялісты выявілі вышэйпералічаныя рэчывы ва ўсіх пробах.

Адкуль яны бяруцца? Часцей за ўсё з прамысловых тавараў: пластыкавых матэрыялаў, касметыкі і сродкаў асабістай гігіены, мыйных сродкаў, фарбаў, канцылярскіх прылад, цацак, мэблі, адзення і многага іншага. А яшчэ могуць трапляць у навакольле як на этапе вытворчасці і ў працэсе выкарыстання прадуктаў і вырабаў, так і пры іх утылізацыі.

Шведскі праект у Беларусі толькі пачынае сваю дзейнасць, але любая экалагічная ініцыятыва карысная і для стану навакольнага асяроддзя, і для змены свядомасці людзей. Усім варта ведаць, што шкодныя рэчывы прысутнічаюць паўсюдна і трапляюць у воднае асяроддзе з гарадскіх тэрыторый, а некаторыя з іх нават могуць негатыўна ўплываць на здароўе чалавека. Крыніцамі такога забруджвання часта з'яўляюцца спажывецкія тавары. Таму неабходна прымаць дадатковыя меры па скарачэнні колькасці небяспечных рэчываў у сцёкавых водах на ўваходзе ў ачышчальныя збудаванні для таго, каб забяспечыць належны ўзровень абароны Балтыйскага мора.

**Вольга ПРАЛЮК.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 6 верасня 2018 года.**